PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 29 (2462) Год XLVIII | Беласток, 20 ліпеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Дзень незалежнасці

Аляксандр Максімюк

Сёлетняму адзначэнню Дня незалежнасці Беларусі спадарожнічала ў Беластоку некалькі значных падзей. Першаю з іх быў візіт намесніка міністра замежных спраў Беларусі Аляксандра Герасіменкі і беларуска-польскія перамовы 4 ліпеня г.г. наконт памежнага супрацоўніцтва рэгіёнаў Беларусі і Польшчы. У перамовах, між іншым, удзел узялі падляшскі і люблінскі ваяводы, маршалак люблінскага ваяводства, прадстаўнік польскага міністэрства замежных спраў, прадстаўнікі гродзенскай і брэсцкай абласцей, пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка і генеральны консул гэтай краіны ў Беластоку Леанід Каравайка. Прадстаўнікі Падляшша на гэтых перамовах назвалі іх польска-беларускай сустрэчай на найвышэйшым узроўні.

Другой падзеяй прымеркаванай да святкавання Дня незалежнасці было адкрыццё 4 ліпеня новай сядзібы генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку па вул. Электрычнай, 9. Абедзве падзеі адбыліся адна за адной, дык састаў запрошаных на адкрыццё гасцей быў і дастойны, і высокага ўзроўню — у адкрыцці, з ліку яшчэ не пералічаных, удзельнічалі паслы Расіі, Украіны і Казахстана.

Віцэ-міністр А. Герасіменка выказаў перад дзвярыма новай сядзібы генконсульства спадзяванне, што будуць яны — дзверы — шырока адкрыты для грамадзян Польшчы і Беларусі. „Я шчыра спадзяюся, — сказаў А. Герасіменка, — што мяжа не стане ні жалезнай, ні аксамітнай заслонай". Віцэ-міністр прывітаў адтэрмінаванне Польшчай візаў для беларусаў, але падкрэсліў, што ва ўсім гэтым працэсе трэба бачыць і інтарэсы звычайных грамадзян. Анджэй Залуцкі ад міністэрства замежных спраў Польшчы пажадаў персаналу генконсульства плённай працы ў карысць збліжэння беларускага і польскага грамадстваў, а затым аркестр добраахвотніцкай пажарнай стражы з Сухаволі адыграў гімны Беларусі і Польшчы, над консульствам залунаў беларускі сцяг і афіцыйнае адкрыццё закончылася. Пасля дастойныя госці перайшлі ў недалёкую гасцініцу „Галэмбеўскі" на прыём.

Святкаванне ў Беластоку беларускімі дыпламатамі Дня незалежнасці — добрая нагода для назірання зменаў у палітычных, але не толькі, звычаях, якія адбываюцца ў суседняй краіне. Пералік тых зменаў можна пачаць з самага істотнага — мяняецца

[працяг ☞ 2]

Фота Ганны Кандрацюк

Бетонамяшалка і блакітна-чырвона-жоўтая карціна, па якой трэба ступаць

Экстравагантнасць і боль у бетоне

Ганна Кандрацюк

O, Jezu! Co on znowu wymyślił... — старэйшая жанчына хапаецца за голаў. На прапанову сябры, каб мінуць выстаўку, рашуча пратэстуе: No wiesz co, Tadek?!

Лёнік Тарасэвіч зноў заатакаваў экстравагантнасцю. Уваход на яго „Мастацтва" — так завецца выстаўка — прымушае развітацца з традыцыйным наведваннем галерэі. Па карцінах трэба ступаць, назіраць іх з усходаў або са спецыяльна сканструяваных вышак. І парадаксальна, гэты прыём дзейнічае як магніт. Наведвальнікі ідуць сюды як заварожаныя, міжвольна, прытым соляць жывыя, зусім не мастацкія каментары:

— Jak oni to teraz posprzątają! — „абураецца" згаданы пан Тадэк.

У першай зале чакае нас агрэсіўнае мора колераў і незвычайны досвед. Па жоўта-чырвона-блакітнай карціне ўфармаванай з бетону трэба ступаць нагамі. Пасярэдзіне крыважэрнага мора — тры бетонамяшалкі. Знутры выцякае застылая маса.

Голас з нутра

Выстаўка, якая з 23 чэрвеня г.г. працуе ў Цэнтры сучаснага мастацтва ва Уяздоўскім замку ў Варшаве, па сутнасці — працяг праекта, які мастак паказаў у Польскім павільёне на 49 Біенале сучаснага мастацтва ў Венецыі ў 2001 годзе. Адначасова перасякае яго, ставіць новы крок у пошуках мастака.

— Калі ласка, зважайце на лесвіцы, — папярэджвае асістэнтка, сядзячая паміж заламі.

У другім памяшканні глядач прываблены ў сярэдзіну мастацкага вобраза. Навокал адмыслова расстаўлены рыштаванні і лесвіцы. Карціну назіраем з „нутра" і згары. Разнавідныя перспектывы ўнушаюць назіраць вобраз вертыкальна, гарызантальна, згары, знізу. Жалезныя рыштаванні і ўсходы выконваюць не толькі практычную ролю. Напамінаюць каркас рытуальнай будоўлі, якую ўзносіць мастак.

Глядач адчувае загубленасць, карціна пачынае дамінаваць і гнесці яго. Гэтую залу наведвальнікі пакідаюць амаль „уцякаючы".

Падземным шляхам на вышкі

Працяг выстаўкі зноў шакіруе сваёй кантрастнасцю. У чарговай, белай зале стаіць шасцікутнік. Чырвоны бетонны манумент, без доступу ў сярэдзіну. Фігура бачыцца як помнік, кідае кружыць вакол сябе. Дарогу ў далейшую гісторыю выстаўкі знаходзім у правым баку) залы. Перад намі адкрываецца аранжава-чырвоны падземны тунель. Блакітнай сцежкай-калідорам рухаемся чым хутчэй у крайнюю вежу замка. Падземная вандроўка выклікае млосць і страх, аднак перспектыва новага вобраза цягне ўперад. У канцы наведвальнік атрымае ўзнагароду — аддушку. За аранжавым памяшканнем віднее акно з панарамай на стары парк.

Паасобныя этапы выстаўкі, крок за крокам, авалодваюць сваёй татальнай вобразнасцю, рытмам лесу каркаса. Глядач не ў змозе спыніцца даўжэй нават ля акна з дрэвамі. Збіты з панталыку чамусьці зноў вяртаецца ў залу з бетонамяшалкамі. Тут адшукае „штосьці" — ці не мэту пошукаў?

У пакойчыку гарызантальна пастаўлены блакітна-чырвона-жоўтыя карціны на рыштаваннях. Па драўляных лес-

[працяг ☞ 3]

Дзе шукаць незалежнасць ☞ 2

З ліпеня ў Беларусі быў адзначаны Дзень Незалежнасці, ці як яго яшчэ афіцыйна называюць — Дзень Рэспублікі. На фоне апошніх непаразуменняў з галоўным саюзнікам — Расіяй, гэтае свята ўсё больш набывае даволі дзіўны змест. На сённяшні дзень можна сведчыць аб існаванні трох поглядаў на саму незалежнасць беларускай краіны.

Вяртанне свойскасці ☞ 4

Маёмасць, якую выпрацавала пасля вайны некалькі пакаленняў палякаў, была разграблена палітычнымі кланамі. Калі прыходзілі да ўлады постсалідарнікі, пару месяцаў пазней грамадзяне чакалі якой-небудзь змены; калі два гады таму з'явіліся посткамуністы, вярнулі ўсе, добра ім вядомыя, прынцыпы кіравання, характэрныя эпосе „пээнэру".

Знаёмства з самаўрадавай дзейнасцю ☞ 5

Беларускі самаўрадавы форум з 29 чэрвеня па 2 ліпеня арганізаваў у Гайнаўцы стажыроўку для дэпутатаў самаўрадаў з Рэспублікі Беларусь. Самым лепшым урокам быў удзел у сесіі Гарадской рады ў Гайнаўцы. Беларускія госці выслухалі дыскусію пра перспектывы турыстычнай дзейнасці ў Гайнаўцы. Прапанавалася стварэнне на акраінах горада воўчага парку.

Заклік пушчы ☞ 8

Уладзімір Мусько першы раз рашыўся паказаць сваю разьбу, якую выконвае па каранях дрэў. Знаходзіць іх на тарфяніках побач Міхалова. Хаця карані доўгі час ляжалі ў торфе, захавалі добры, арыгінальны выгляд. На выстаўцы найбольш выяваў птушак і звярыных матываў.

Кніжка-юбілярка ☞ 9

Георгій Карцоў усяго толькі тры разы наведаў Белавежскую пушчу, а пакінуў па сабе твор, які па сённяшні дзень лічыцца адным з найвыдатнейшых выданняў аб белавежскай жамчужыне. Яго кніжка выйшла ў палове 1903 г., мабыць да прыезду ў пушчу на чарговае паляванне цара Мікалая II, з сям'ёй і гасцьмі.

Варожка праўду сказала ☞ 10

Прыйшлі немцы, а Мішы не было 2 тыдні, ды не толькі яго. Разам з іншымі жанчынамі пайшла я ў Дубіны да варожкі, якая клала карты. Варожка мне сказала, што муж мой дзесьці недалёка блукаецца, скора прыйдзе, што мы будзем доўга і шчасліва жыць і нажывем сямёра дзяцей.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Святкаванне 10-годдзя Першага з'езду беларусаў свету

6 ліпеня г.г. адбыліся святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя 10-м угодкам Першага з'езду беларусаў свету. Віншаванні з юбілеем прыходзілі ў адрас Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына" ўжо задоўга да гэтага ўрачыстага дня.

Святочныя мерапрыемствы пачаліся а 14-й гадзіне. На вуліцы Койданаўскай (цяпер Рэвалюцыйная) у фае дома № 15 — будынку, дзе ў 1921 г. быў заснаваны Інстытут беларускай культуры, — адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі, прысвечанай дзеячам гэтай навучальнай установы. У прысутнасці творчай інтэлігенцыі, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый Беларусі і дыяспары, карэспандэнтаў урачыстасць пачаў акадэмік Радзім Гарэцкі, выступіў ініцыятар стварэння дошкі прафесар Адам Мальдзіс. Аўтар гэтага манументальнага твора скульптар Алесь Шатэрнік урачыста адкрыў мемарыяльную дошку і прачытаў вельмі пранікнёны верш.

А палове на шостую ў вялікай зале Дома літаратара распачалася ўрачыстасць з удзелам дэлегатаў і гасцей Першага з'езду. Як і Першы з'езд беларусаў свету, гукі сурмы абвясцілі аб пачатку ўрачыстага пасяджэння. У прыўзнятай атмасферы загучаў гімн Згуртавання „Бацькаўшчына" і слынны беларускі гімн „Мы выйдзем шчыльнымі радамі". Перад прысутнымі выступілі акадэмік Радзім Гарэцкі, старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Алесь Пашкевіч, даследчыца Лідзія Савік, гісторык Леанід Лыч, экс-міністр замежных спраў Пётр Краўчанка, экс-міністр інфармацыі Анатоль Бутэвіч, прадстаўнікі беларусаў: Літвы — Хведар Нюнька, Польшчы — Яўген Вапа, і Расіі — Антон Сабалеўскі.

Падчас урачыстасці працавала вялікая выстава, прысвечаная тром з'ездам беларусаў свету, якія прайшлі за гэты час, і дзейнасці „Бацькаўшчыны" за 10 мінулых год.

А 19-й пачаўся святочны канцэрт. Канцэртная праграма была пабудавана на шэдэўрах беларускай музыкі ад XV да пачатку XX стагоддзяў. Трыо „Вытокі" пазнаёміла публіку з творамі Міхала Казіміра Агінскага, Міхала Клеафаса Агінскага, Міхала Ельскага. Далей на сцэне загучалі старадаўнія беларускія мужчынскія спевы ў выкананні фальклорнага гурту „Кудмень". Завяршыў канцэртную праграму гурт сярэднявечнай беларускай музыкі „Стары Ольса" з высакароднай і рашучай музыкай старадаўніх літвінаў.

Яшчэ доўга не разыходзіліся людзі. У вестыбюлі спявалі „Пагоню" і іншыя патрыятычныя песні.

Урачыстасць адбылася дзякуючы сумесным арганізацыйным намаганням „Бацькаўшчыны" і Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Інфармацыйны цэнтр МГА ЗБС „Бацькаўшчына", 9.07.2003 г.

Дзень незалежнасці

[1 ☞ працяг]

сама дата святкавання. Дзень 3 ліпеня — гадавіна вызвалення ў 1944 годзе Мінска — быў устаноўлены святам незалежнасці ў выніку рэферэндуму 1996 года. Да гэтага часу адроджаная Беларусь сваю незалежнасць святкавала 27 ліпеня — у гэты дзень у 1990 годзе Вярхоўны Савет прыняў дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце. Другая перамена, якая злёгку адчувалася ў паветры, заключаецца ў тым, што 4 ліпеня 2003 г. у Беластоку нібыта адкрывалася не новая сядзіба, а само генконсульства. Калі прамоўцы віталі персанал дыпламатычнага прадстаўніцтва і гасцей з гэтай падзеяй, дык усё тое атрымлівалася, быццам на Электрычнай, 9 адкрываецца не новы будынак, а ўстанаўляецца консульскае прадстаўніцтва. Пра тое, што прадстаўніцтва працуе ў нашым горадзе больш за 10 гадоў, ужо не згадвалася. Гэтае (неафіцыйнае) бяспамяцтва Беларусі Аляксандра Лукашэнкі да Беларусі Станіслава Шушкевіча ў нечым знамянальнае.

Нельга абысці ўвагай і пэўныя новыя элементы ў мове дыпламатаў — кіраўнікоў абласцей у Беларусі завуць цяпер губернатарамі. Мабыць, у самой Беларусі тэрмін увайшоў ужо ў норму, але для мяне прагучаў шурпата, бо ад калі адроджаная Беларусь дзеліцца на тыя губерні?

Падзеі і сустрэчы на высокім узроўні працягваліся. 5 ліпеня віцэ-міністр А. Герасіменка сустрэўся з кіраўніцтвам Беларускага грамадска-культурнага таварыства (БГКТ). На сустрэчы той А. Герасіменка паабяцаў дзяржаўную падтрымку для беларускай супольнасці ў Польшчы. Старшыня БГКТ Ян Сычэўскі падкрэсліў ролю такой падтрымкі і добрых адносін яго арганізацыі з беларускім урадам. Дэкларацыю падтрымкі паўтарыў яшчэ пасол Беларусі П. Латушка ў Белавежы на сустрэчы з членамі Літаратурнага аб'яднання „Белавежа" Георгіем Валкавыцкім і Аленай Анішэўскай. Пасол павіншаваў іх з 45-годдзем арганізацыі ды адзначыў ролю, якую Аб'яднанне „Белавежа" адыграла ў захаванні беларускай культуры і гістарычнай спадчыны. Удзельнікі сустрэчы пагадзіліся, што трэба ўзнавіць супрацоўніцтва Аб'яднання з беларускімі дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі.

Аляксандр Максімюк

Дзе шукаць незалежнасць

3 ліпеня ў Беларусі быў адзначаны Дзень Незалежнасці, ці як яго яшчэ афіцыйна называюць — Дзень Рэспублікі. На фоне апошніх непаразуменняў з галоўным саюзнікам — Расіяй, гэтае свята ўсё больш набывае даволі дзіўны змест.

На сённяшні дзень можна сведчыць аб існаванні трох поглядаў на саму незалежнасць беларускай краіны. Першы, якога прытрымліваецца нацыянальна арыентаваная дэмакратычная апазіцыя, гэта з'яўленне незалежнасці ў выніку бурлівых падзей 1917-1918 гадоў, калі была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка. Нягледзячы на тое, што падобныя рэчы ў тыя гады адбыліся на многіх ускраінах былой Расійскай імперыі, з-за чаго на карце Еўропы з'явіліся такія краіны як Фінляндыя, Польшча, Літва, Латвія, Эстонія і іншыя, сёння на дзень 25 сакавіка цяперашняя беларуская ўлада глядзіць непрыязна. Маўляў, якая магла быць незалежнасць, калі ўсё адбылося пад нямецкай акупацыяй, ды і колькі ўвогуле праіснавала БНР? Пра тое, што само абвяшчэнне прадвызначыла з'яўленне Савецкай Беларусі, а потым і Рэспублікі Беларусь чамусьці не ўзгадваецца.

Сур'ёзным штуршком да сапраўднай незалежнасці стала прыняцце Вярхоўным Саветам (тагачасным парламентам) Дэкларацыі аб незалежнасці БССР у 1990 годзе. Пасля путчу ў жніўні 1991 г. у Маскве, ёй быў нададзены статус канстытуцыйнага закону, што азначала вяршынства Дэкларацыі над законамі Савецкага Саюза на тэрыторыі беларускай рэспублікі. Несумненна, дата паважная і адзначалася яна некалькі гадоў як дзяржаўнае свята. Праўда, стаўленне да яе ў тыя гады з боку большасці насельніцтва было як і да самой незалежнасці, якая нечакана звалілася на галовы беларусаў. Таму, калі першы беларускі прэзідэнт і ягонае атачэнне ўзялі курс на рэсаветызацыю Беларусі, яны з лёгкасцю „патлумачылі" чаму святкаваць незалежнасць 27 ліпеня нельга. Бо менавіта такім жа летнім днём 1943 года гаўляйтар Беларусі Кубэ дазволіў карыстанне бел-чырвона-белым сцягам і гербам „Пагоняй". А гэтыя сімвалы з 1995 года сталі „крамольнымі". Шчыра кажучы, асабліва ад знікнення са святочнага календара Дня незалежнасці 27 ліпеня не перажываў у Беларусі ніхто. Дата папросту не паспела прыжыцца ў свядомасці людзей. У выніку лукашэнкаўская ўлада, зразумела, праз рэферэндум, прапанавала беларускаму народу лічыць Днём незалежнасці дату 3 ліпеня. Бо ў той дзень у 1944 годзе ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў вызвалены Мінск. Канешне, да беларускай незалежнасці гэтая падзея мае найменшае з усіх вышэйадзначаных дат дачыненне. Хаця і адмаўляць у яе важнасці нельга. Усё ж пасля другой сусветнай вайны беларуская рэспубліка займела месца ў ААН, набыла рысы хоць фармальнага, бо ўваходзіла ў склад СССР, але ж суверэнітэту. І, палажыўшы руку на сэрца, варта сказаць, што трэцяму ліпеня найбольш падыходзіць называцца менавіта Днём Рэспублікі і ніяк інакш, калі ўвогуле змяшчаць дату ў пераліку дзяржаўных свят Беларусі.

На працягу амаль усіх папярэдніх гадоў з вуснаў прадстаўнікоў беларускай улады падкрэслівалася, што незалежнасць краіны можа быць дасягнута толькі праз інтэграцыю з Расіяй і яднанне двух славянскіх народаў. Калі ж з мінулага года Расія стала больш канкрэтна падыходзіць да пытанняў „саюзнага будаўніцтва", на паверхню палітыкі выйшла столькі супярэчнасцей у поглядах на „яднанне" паміж саюзнікамі, што паўстае пытанне — аб чым можна было беларускаму прэзідэнту амаль дзесятак гадоў дамаўляцца, каб цяпер казаць аб нейкай інфармацыйнай вайне з боку Расіі і жаданні абстрактных расійскіх алігархаў паглынуць беларускую эканоміку. Ужо і расійскі рубель непатрэбны, калі не даюць ім кіраваць. У выніку ў палітыцы Беларусі адбыўся разварот на 180 градусаў — ад „яднання" да ўсхвалення незалежнасці, якую ніякім чынам нельга страціць. Карані ж гэтай незалежнасці, калі разумець А. Лукашэнку, маюць свой пачатак у часах другой сусветнай вайны, партызанскім руху. Даволі цікавая выснова, асабліва зважаючы на тое, што ў іншых краінах момант узнікнення прагі да незалежнасці таго ці іншага народа стараюцца шукаць недзе ў глыбіні стагоддзяў.

Хаця нейкая логіка ў новых ідэалагічных накірунках беларускай улады ёсць. Праз пэўны час, калі ў „інтэграцыі" адчуецца пацяпленне і беларуска-расійскія ўзаемаадносіны выйдуць на „новы якасны ўзровень", можна будзе падкрэслена казаць аб тым, што ў вайне мы змаглі перамагчы толькі разам.

Аднак не ўсё так дрэнна. Бо нарэшце з вуснаў улады загучалі паважлівыя словы да незалежнасці ўласнай краіны. Можа гэта і часова, і праз супрацьпастаўленне сваіх парадкаў парадкам іншых краін ды міжнародным правілам, але ўсё ж такі, здаецца, застанецца неблагая глеба для незалежнага дэмакратычнага будучага сённяшняй аўтакратычнай Беларусі.

Уладзімір Лапцэвіч

Тыдзень беларускай культуры ў Іркуцку

Ад 26 да 31 мая ў Іркуцку ў Расіі адбыўся Тыдзень беларускай культуры. У ходзе мерапрыемства выступілі мясцовыя калектывы „Самоцветы", „Ленушка", „Варэнічкі", „Рушнічок", дэманстраваліся кінафільмы „Раскіданае гняздо", „У жніўні 44-га", „Зорка Венера", „Ідзі і глядзі" і „Купальская ноч", а на вечары пад лозунгам „Гістарычны шлях беларускіх гарадоў" сябры Іркуцкага таварыства беларускай культуры знаёміліся з мінулым Мінска, Гродна і Полацка.

28 мая ў Бібліятэцы імя Малчанава-Сібірскага адбылася прэм'ера трох новых мерапрыемстваў ІТБК: выстаўкі кніг аб Беларусі, прэзентацыя кнігі Алега Рудакова „Белорусские обрядовые праздники" і конкурс дэкламатараў-чытальнікаў „Табе, Беларусь, прысвячаю свой твор". Дзень пазней у мясцовым Палацы дзіцячай і маладзёжнай творчасці адбыліся „Беларускія вячоркі". Іркуцкі беларускі тыдзень закончыў гала-канцэрт „Гучы гоман беларускі", які прыцягнуў 500 гледачоў.

Алег Рудакоў

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Лявон Тарасэвіч

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Тунель. У канцы акно з відам на стары парк

Экстравагантнасць і боль у бетоне

[1 ☞ працяг]

віцах падымаемся на вышкі. Уверсе відаць прыхаваную ад вачэй карціну. Адкрыццё ашарашвае і напаўняе шчасцем.

— Ці не патрабуеце часам дапамогі? — азываецца знізу асістэнтка. Каб спусціцца з круцёлкай у галаве на зямлю, гледачы часта карыстаюцца „чатырма нагамі".

Татальны Лёнік Тарасэвіч

Выстаўка Лёніка Тарасэвіча нарабіла шуму, якога ўжо даўно не ведала мастацкае асяроддзе ў Польшчы. На яе глядзяць шматбакова і шматкрытычна. „Мастацтва" бачыцца не толькі як аповед пра працэс узнікання мастацтва. Гэта штуршок для спрэчак пра межы сучаснага мастацтва. Ці не прыйшоў канчаткова канец класічнаму яго разуменню? Іншыя бачаць тут пачатак новай з'явы.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дарога на вышкі

Лявон Тарасэвіч ідзе спераду сучасных мастакоў Польшчы. Яго поспех — у адважным перасяканні заваяваных ім межаў і творчай шчырасці. Прытым, усе новыя этапы — паслядоўнасць папярэдняга працэсу. Тарасэвіч згодна з логікай паслядоўнасці вымушаны прабівацца да канца. Сучасная крытыка, невыпадкова, яго творчасць заве „татальным мастацтвам".

Мастак родам з Валілаў што на Гарадоччыне татальны ў вернасці сваім караням і крыві. Пры кожнай нагодзе адзначае сваю вязь з беларушчынай і Беласточчынай.

Ганна Кандрацюк

* Лявон Тарасэвіч
Мастацтва
ГАЛЕРЭЯ 2
23 чэрвеня — 7 верасня 2003 г.
Куратар: Міляда Слізінская
Выстаўка працуе пад ганаровым патранатам Міністра культуры РП Вальдэмара Дамброўскага.

Ноч цудаў, мараў і кахання

Купалле ў Белавежы, якое праходзіла ў суботу, 5 ліпеня, як штогод, прыцягнула ўвагу жыхароў Гайнаўкі, Бельска, Беластока і навакольных вёсак, хаця не бракавала і ўдзельнікаў з далейшых мясцовасцей Польшчы — Шчэціна, Торуні, як і замежных гасцей (пераважна немцаў). Мерапрыемства ўдастоілі дыпламаты: Павел Латушка — пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы, генеральны консул Беларусі ў Беластоку — Леанід Каравайка. Не бракавала палітыкаў (сенатар Сяргей Плева, пасол Аляксандр Чуж) і прадстаўнікоў самаўрадаў з усяго Падляшша.

„Купальская ноч — гэта ноч цудаў, мараў і кахання. Таемная ноч, калі кожны чалавек мае шанц знайсці кветку шчасця — папараць-кветку", — такімі словамі прывітаў сабраных старшыня БГКТ Ян Сычэўскі. Ды і людзі пачалі шукаць...

Мерапрыемства пачалося традыцыйна. Некалькі хвілін пасля дзевятай вечара перад публікай прайшлі, трымаючы ў руках вянкі, маладзёжны хор БГКТ „Каласкі", „Васілёчкі" з Бельска, „Арэшкі" з Арэшкава, „The-Best" з Сямятыч, „Сакрэт" з Міхалова, „Куранты" з Бельска, хор БГКТ „Крыніца", „Чыжавяне" з Чыжоў, „Рэчанька" з Козлік, якія пазней выступілі на эстрадзе.

Гасцінна на белавежскай сцэне паявіліся таксама народны ансамбль песні і танца „Церніца" і гурт „Шкляры" з Беларусі. Апошні аказаўся „гітам" Купалля. Заахвочваў ён публіку да танца не толькі народнымі песнямі ў навейшых аранжацыях, што асабліва падабалася моладзі, але і польскім выкананнем вядомай песні „Daj mi tę noc, tę jedną noc". Аднак не было ў гэтым годзе „Прымакоў", „Аса", не выступіў гурт „Лідэр", якіх найбольш чакалі ўдзельнікі. Некалькі хвілін пасля поўначы белавежскае неба рассвятлілі феерверкі, а па рэчцы паплылі вянкі, вылавіць якіх таксама былі ахвотныя.

— У гэтым годзе Купальская ноч не мела ў сабе такога „чару" як год таму, — гаворыць Анна Чарнэцка з Беластока, якая з сям'ёй прыехала ў Белавежу. — Нібы было як заўсёды: гурты, феерверкі, пусканне вянкоў і гульні да самай раніцы але... Сама не ведаю, але чагось бракавала, а можа было і замнога чагосьці.

Такія меркаванні часта можна было пачуць ад пастаянных удзельнікаў мерапрыемства.

З году на год на Купалле прыязджае штораз больш людзей, асабліва моладзі, што з аднаго боку цешыць, а з другога здзіўляе і непакоіць. Цешыць, бо моладзь гэта наша будучыня, а непакоіць па простай прычыне — Купалле сталася месцам, дзе маладыя людзі не толькі спатыкаюцца, каб паслухаць музыку, але месцам, дзе разам з сябрамі можна „добра загуляць", адным словам — выпіць. А з гэтым у Белавежы не было ніякіх праблем. Расстаўлены сталы з гамбургерамі, гот-догамі, цукеркамі і цацкамі, а побач іх ларкі з півам, якое купіць можна было без праблемы, а вынікі спажывання былі відны! Маладыя, 13-15-гадовыя дзяўчаты, з банкамі піва ў руках і вяночкамі на галовах сядзелі над ставамі сумна ківаючыся ў рытм музыкі, якую нясло над вадой рэха. На жаль, не былі гэта адзінокія вобразы. Толькі жаль бярэ, што маладыя людзі, праўда, не ўсе, якія прыехалі ў Белавежу, не мелі ўяўлення якая меншасць арганізуе гэтае мерапрыемства, не патрапілі пералічыць хаця двух гуртоў, якія выступалі на сцэне. Трэба аднак сказаць, што ў гэтым няма ніякай віны арганізатараў, якія пастараліся забяспечыць цэлую імпрэзу, што ім і ўдалося, а адказнасці за захаванне маладых удзельнікаў браць яны на сябе не могуць.

Паўліна Шафран

Завершаны набор

У пачатку канікулаў закончыўся набор вучняў у Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. У белгімназію былі прыняты 58 асоб (усе ахвотныя). Засталіся яшчэ два вольныя месцы і ахвотныя вучыцца ў гэтай школе могуць яшчэ прыносіць свае дакументы. Інакш было з наборам у белліцэй. Падрыхтаваных было 120 месцаў, а дакументы падалі 238 асоб. Сярод жыхароў Гайнаўкі замацавалася перакананне, што ў белліцэі высокі ўзровень навучання і таму дакументы прынеслі ў школу лепшыя вучні. Пасля першай рэкрутацыі прынята была 121 асоба. Аднак дазвалялася вучням падаваць дакументы ў тры выбраныя школы і таму некаторыя асобы рашыліся паступіць у іншыя школы. З ліку прынятых у белліцэі засталося 93 вучняў. Арыгінальныя пасведчанні данеслі яшчэ 30 іншых асоб і ўсе яны былі прыняты. Зараз закончаны набор у гайнаўскі белліцэй, але ёсць яшчэ вольныя месцы ў суседнім Агульнаадукацыйным ліцэі і Комплексе прафесійных школ.

— Вучні і бацькі вельмі хваляваліся ў час набору ў сярэднія гайнаўскія школы. Найгорш было тым, якія ў час першай рэкрутацыі не былі прыняты ў выбраныя імі школы. Варта было б падумаць, каб у Гайнаўскім павеце ўвесці вырашэнні з Варшавы. Там вучні прыносілі дакументы таксама да трох школ, але памячалі ў іх у якой школе найахвотней хацелі б вучыцца. Пасля, паводле колькасці балаў набраных вучнямі, камп'ютэр выбіраў ім школы. Трэба было б купіць у нашым павеце адпаведную праграму для камп'ютэра, тады было б намнога менш хваляванняў і перажыванняў, — заяўляе дырэктар Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы Яўген Сачко. — Часта аб тым, хто прыняты ў ліцэй, вырашаюць 2-3 балы і таму варта ўзяцца за вучобу ў трэціх класах гімназіяў.

Вучні, якія вучыліся ў гімназіях беларускай мове, маглі атрымаць да 15 дадатковых балаў. Без адбору прымаліся ў ліцэі лаўрэаты прадметных конкурсаў. У гэтым годзе ў Гайнаўскі белліцэй прыняты былі 5 лаўрэатаў прадметных конкурсаў, а сярод іх пераможцы Конкурсу беларускай мовы.

Аляксей Мароз

Вяртанне свойскасці

Капіталізм, лібералізм, свабодны рынак так сама пасуе да менталітэту палякаў як беларусаў. Абедзве нацыі ўфармаваліся пад уплывам феадальнай традыцыі. Камунізм так моцна не розніцца ад феадалізму як ад усялякіх ліберальных грамадска-палітычных сістэм. У Беларусі забава ў дэмакратыю і рынкавую эканоміку трывала вельмі коратка. У сапраўднасці была спынена на этапе эксперыментавання. Па волі люду, дэмакратычным шляхам, у 1994 г. быў устаноўлены грамадска-палітычны і эканамічны парадак, які з'яўляецца сінтэзам феадалізму і камунізму. Палякі, якія самі сябе ўжо дваццаць гадоў пераконваюць, што з'яўляюцца часткай заходняй цывілізацыі, пастаянна прабуюць перанесці над Віслу ўсе яе прыкметы. Але няшмат з гэтага атрымліваецца.

Зараз пасля падзення камунізму ў 1989 г. да ўлады прыйшлі сапраўдныя рэвалюцыянеры і рамантыкі, увасабленнем якіх быў апрануты ў джынсавую кашулю Яцак Курань. Не здымаў яе нават калі стаў міністрам. Праз некалькі месяцаў палякі сказалі сабе і пра сябе больш шчырых слоў, чым за ўсё мінулае стагоддзе. Прыемней неяк стала тады жыць у краіне. Пасля, калі сталі праводзіць г.зв. прыватызацыю, было штораз смяшней і страшней. Мяняліся толькі шыльды групаў, што трымалі ўладу, але вынік іх кіравання быў аднолькавы. Маёмасць, якую выпрацавала пасля вайны некалькі пакаленняў палякаў, была разграблена палітычнымі кланамі. Калі прыходзілі да ўлады постсалідарнікі, пару месяцаў пазней грамадзяне чакалі якой-небудзь змены; калі два гады таму з'явіліся посткамуністы, вярнулі ўсе, добра ім вядомыя, прынцыпы кіравання, характэрныя эпосе „пээнэру". Цяпер, пасля скандалу з паслом Ягелам і міністрам Саботкам зусім невядома, дзе праходзіць мяжа паміж мафіяй і людзьмі з вышэйшых эшалонаў улады. Ці яна ўвогуле існуе. Таксама як у час Народнай Польшчы партыйная вярхушка цалкам ігнарує законы. На практыцы палітычныя кланы мяняюць законы паводле сваіх актуальных патрабаванняў.

Але не толькі эліты ўлады змагаюцца за вяртанне добра вядомай сацыялістычнай свойскасці. У банку, дзе павінна працаваць 8 пунктаў абслугоўвання кліентаў, фактычна дзейнічае толькі адзін. Трэба адстаяць гадзіну часу, так як у ваеннае становішча з талонамі на сала, муку і іншыя прадукты.

Подых капіталізму на пачатку дзевяностых гадоў найбольш відавочны быў у гандлі. Нават у перыферыйных крамах дамы за прылаўкам часам мылі рукі, калі раней дакраналіся імі да бульбы, змывалі падлогу. Нядаўна я пабачыў, як уласніца крамы клеіла картачкі з цаной на атруту для мух. Калі падыходзілі пакупнікі, яна спыняла свой занятак і тымі ж нямытымі рукамі падавала хлеб, булкі, сыр. Калі не было пакупнікоў, далей прадаўжала ўпрыгожванне каробак з атрутай. Была свядомая, што для большасці пакупнікоў не перашкаджаюць яе брудныя рукі.

Хаця беспрацоўе ў Польшчы дасягнула небяспечнага дваццаціпрацэнтнага ўзроўню, вельмі цяжка знайсці чалавека, які сумленна выканаў бы простую працу не дамагаючыся платы ў два разы большай за тую, якую атрымлівае універсітэцкі прафесар. Спецыяліст па маляванні сцен дамагаецца сумы, якая, калі б ён працаваў дваццаць дзён, дасягнула б 4 тысяч злотых. Пралетарый, які ўмее злучыць дзве трубкі з металу і называе сябе сантэхнікам, сваю працу ацэньвае на ўзроўні ваяводы. Іншая справа, што пасля кожнага з названых спецыялістаў трэба прыбіраць кватэру як пасля паводкі.

Свет васьмідзесятых гадоў, які паказваўся ў фільме *Alternatywy 4*, цалкам рэальны і сёння. Далей жыве сярод нас той самы партыйна-гмінны чыноўнік, лекар-хабарнік, неахайны рамеснік і люд, які пагаджаецца на існаванне такога стану. А заходні капіталізм, заходняя арганізацыя і этыка працы можа калісьці і ў нас будзе. Пэўна дачакаюцца тыя, што цяпер наведваюць садок.

Яўген Мірановіч

Вачыма паляка

Будзь здаровы?

Трапіў я выпадкова ў Раённую ўправу па працаўладкаванні. Быў я там апошні раз гады два таму. Нічога там не змянілася — тлумы перавальваюцца па калідорах такія ж, як і раней. Адразу падумаў: і як тут верыць у выказванні прадстаўнікоў урада, што беспрацоўе скарачаецца. Як і тады, так і цяпер найбольш маладых, значыць, наведвальнікаў да сарака гадоў. Выпадкова падслухаў, як адзін з іх распытваў чыноўніцу:

— Больш за год у мяне няма пастаяннае працы, штосьці там падзарабляю на працы па безасабовым фондзе — на „дамову-заказ". У сярэднім зарабляю раз 200, раз 300, а час ад часу і 400 злотых. Цяпер прыхварэў. Хачу пайсці да лекара. Няма ў мяне грошай на прыватнае лекаванне. Ці магу зарэгістравацца як беспрацоўны, вядома, без права на ўспамогу, але толькі для таго, каб мець страхоўку на лячэнне?

Маладая, надзвычай ветлівая чыноўніца, развяла рукамі:

— На жаль, не. Калі вы зарабляеце хоць адну залатоўку, не можаце. Можаце зарэгістраваць уласную гаспадарчую дзейнасць. Тады ў месяц трэба адводзіць на ўсе павіннасці больш за 600 злотых...

Тут мужчына збялеў. А чыноўніца працягвала:

— Ну, яшчэ можаце на страхоўку адводзіць самі ў Фонд здароўя каля 200 злотых.

— Але ж я больш мушу плаціць хоць бы за сваю кватэру, — прабаваў тлумачыць мужчына.

— Даруйце, але абавязваюць такія правілы, — старалася далікатна тлумачыць пані з акенца.

Мужчына, у поўні сваіх жыццёвых сіл, апусціў галаву і ўступіў месца наступным у чарзе.

Стаў я думаць, што застаецца гэтаму чалавеку. У прынцыпе толькі адно: перастаць лавіць халтуры за тыя 300-400 злотых (значыць, дамовы-заказы). Тады зможа зарэгістравацца як беспрацоўны. Праўда, не будзе мець грошай (у тым, у яго сітуацыі, права на ўспамогу), але затое зможа лячыцца, будзе мець права на бясплатнае лячэнне, значыць, будзе мець такую магчымасць. Праўда, будзе мерці з голаду, але, урэшце, абяссілены, заўсёды трапіць у шпіталь, дзе яго будуць падтрымліваць нейкі час кропельніцамі, а, можа, калі здарыцца цуд і патрымаюць яго там з тыдзень, стравамі не толькі вадкімі.

Застаецца яму яшчэ, калі адмовіцца ад заказаў і зарэгіструецца ва ўстанове па працаўладкаванню, хадайнічаць за ўспамогу ў цэнтры сацыяльнай апекі. Але калі яму нават такую дадуць, дык аднаразовую, больш-менш палову таго, што яму трэба, каб заплаціць на месяц за кватэру. Не можа разлічваць на пастаянную ўспамогу, бо адмовіўся ад часовых, але рэгулярных заробкаў, якія перавышаюць мінімум, патрэбны для атрымання ўспамогі...

Бачу наўкола, што такіх людзей, як напатканы мною ва Управе па працаўладкаванні чалавек — значна больш. Як незарэгістраваныя, папраўляюць статыстыку беспрацоўя. Могуць затое павышаць статыстыкі пахавальных устаноў. Есці і жыць жа ж трэба. Хварэць, мабыць, не трэба, але ці гэта ад нас залежыць? Трапіў мне ў рукі рапарт аб рынку працы і беспрацоўі ў Польшчы, падрыхтаваны адміністрацыяй на пераломе вясны і лета. Яго аўтары з клопатам прызнаюцца, што гэта аграмадная праблема. Аднак, за такі стан рэчаў абвінавачваюць папярэдні ўрад. У палове кадэнцыі Рады міністраў і амаль за год функцыянавання сённяшніх самаўрадаў цяжка паверыць, што толькі ў тым ёсць віна. Няма механізмаў, якія б уплывалі на ўзніканне новых месцаў працы. Ёсць толькі заявы, што ўсё ідзе да лепшага. Я не ўпэўнены, аднак, ці такія людзі, як той напатканы мною, дачакаюцца лепшага часу, ці не адубеюць хоць бы ад таго толькі, што не могуць пайсці да лекара. З другога боку (з кіраўнічага пункту гледжання), дык, мабыць, і добра было б, калі б гэтак і сталася?! Чым менш патрабуючых працы, тым той рынак — большы!

Мацей Халадоўскі

План на 15-20 гадоў

Добраўпарадкаванае Падляшша

Здзіслаў Пліхта, намеснік дырэктара Падляшскага бюро прасторавага планавання і добраўпарадкавання Падляшскага ваяводства прадставіў на каляровай карце нашага ваяводства з зазначанымі на ёй дарогамі, газа- і нафтаправодамі, электралініямі новы план добраўпарадкавання Падляшша. План вытычвае накірункі развіцця ваяводства. Моцна акцэнтуецца ў планах добраўпарадкавання ахвова асяроддзя. У найбліжэйшай будучыні маюць быць ахоплены аховай чарговыя прыродныя комплексы. Больш за чвэрць паверхні Падляшша апынецца на абшарах спецыяльнай аховы „Еўрапейскай экалагічнай сеткі Натура 2000". Апрача нацыянальных паркаў (Сувальскі ландшафтны парк, Вігерскі і Бебжанскі нацыянальныя паркі, Кнышынская пушча з Кнышынскім ландшафтным паркам і пушча паміж Крынкамі і Баброўнікамі, Даліна Нарвы (каля Ломжы), Нарвянскі ландшафтны парк — далейшы адрэзак, Белавежская пушча амаль у цэласці, на поўдні — даліна рэчкі Буг), у еўрасаюзную сетку Натура 2000 закваліфікаваны і абшары, якія сёння не маюць яшчэ статуса тэрыторый праўна прыродна ахоўваных, як, напрыклад, даліна ніжняга Буга, даліна Пісы — Курпі. Ідэя польскіх абшараў сеткі Натура 2000 апрацавана краёвым Цэнтрам стратэгічных студый і Міністэрствам аховы асяроддзя ў паразуменні з Еўрасаюзам. Плюсам гэтага ёсць тое, што гміны будуць мець дадатковыя грошы на экалагічныя інвестыцыі, кожны жыхар сеткі зможа далей карыстацца сваімі грунтамі, як да гэтай пары — не будзе забарон уваходу на ахоўваемыя тэрэторыі, пачнуць абавязваць дырэктывы „птушыная" і „ачагавая" (siedliskowa) — першы аб ахове птушак, другі — аб ахове натуральных пасяленняў флоры і фауны; пачнецца аблясенне грунтаў для патрэб сельскай гаспадаркі; стан аховы прыроды будзе кантраляваць таксама Еўрапейская камісія. Самаўрадаўцы звярнулі ўвагу на адмоўныя вынікі быцця ў сетцы — кожную інвестыцыю, якая можа адмоўна паўплываць на стан паселішчаў або ахоўных відаў (напрыклад, высечка дрэў, пабудова дамоў ці прамысловыя інвестыцыі) трэба будзе ацаніць наконт яе ўплыву на асяроддзе; інвестар мусіць правесці ацэнку за свой кошт, скантралюе яе і камісія з Міністэрства аховы асяроддзя або Галоўны санітарны інспектар. Як заўважылі самаўрадаўцы, часам „ашаломленыя" эколагі не дазваляюць на ахоўваных тэрыторыях нічога рабіць. У іншых ваяводствах нават нацыянальныя паркі не занесены ў сетку Натура 2000. Размовы аб праекце аховы асяроддзя выклікалі сварку паміж самаўрадаўцамі; некаторыя сцвердзілі, што такі падыход да ваяводства як да „скансэну" можа давесці да таго, што „палезем у пятлю".

Да гарадоў рэгіянальнага рангу мае быць далучаны Бельск-Падляшскі. Мае гэта для яго прэстыжнае значэнне, паколькі будзе магчы ў агульнапольскіх планах развою старацца за фінансы прызначаныя для гарадоў вышэйшага рангу. Горад Беласток атрымае цэнтральную рэгіянальную функцыю (еўраполіс), павятовыя гарады, такія як Гайнаўка, Сейны, Сямятычы ці Замбраў будуць мець дадатковыя функцыі (прамысловыя, адпачынковыя ды турыстычныя), паасобныя гарады ды гмінныя адзінкі, і асобныя мястэчкі ды вёскі, не маючыя адміністрацыйнай функцыі, маюць пазначаныя ў плане добраўпарадкавання намечаныя функцыі, напрыклад Супрасль, Шэпятова, Цехановец, Браньск, Драгічын, Тарнопаль, Плёскі, Рыбакі, Бандары. Як зазначана ў плане, гэта будзе мець значэнне для гэтых мясцовасцей у час уваходу і ўдзельніцтва краіны ў Еўрасаюзе.

План добраўпарадкавання Падляшша прымае пад увагу міжнародныя сувязі — камунікацыйныя (еўрапейскі транспартны калідор Хельсінкі — Талін — Рыга — Коўна — Варшава, еўрапейская экспрэсная дарога S-8 Via Baltica, чыгуначны шлях Rai Baltica — магістральная дарога Е-75 Варшава — Талін). Звязана ўсё гэта з мадэрнізацыяй і дастасаваннем да еўрапейскіх нормаў перавозаў, напрыклад, дастасаваннем дарог да грузападымальнасці 115 тон на вось, бескалізійнымі вузламі з лініямі ваяводства, скрыжаваннямі з павятовымі, аб'ездамі гарадоў і іншых адзінак, а на чыгнуцы — дастасаваннем хуткасці да 160 км у пасажырскіх, 120 у таварных цягніках, камбінірваным транспартам — „Аўтафуры на пуці". Дарогі, напрыклад, экспрэсная 19 — Санкт-Пецярбург — Гродна — Кузніца — Беласток — Бельск-Падляшскі — Сямятычы — Люблін — Жэшаў — маюць значэнне не толькі для нашага ваяводства, разгружаюць абцяжараныя лініі, спалучаючы поўнач з поўднем Еўропы.

У сённяшні час газаправоды, нафтаправоды і электралініі аплятаюць большыя тэрыторыі, падключаны яны да міжнародных ліній. Мае быць разбудавана размеркавальная сетка, дабудоўваюцца аддзельныя галінкі ў розных напрамках. Лініі высокага напружання, газаправоды і нафтаправоды нясуць пагрозы для натуральнага асяроддзя, ахова якога выразна намечана ў плане прасторавага добраўпарадкавання ваяводства. Бярэцца пад увагу і паасобныя правілы, якія датычаць, напрыклад, чыстаты вод.

Гэта стратэгічны праект, атрымалі яго раней для кансультацыі бурмістры, войты ды пазітыўна ацаніла Міністэрства інфраструктуры. Адбыліся сустрэчы з самаўрадаўцамі гмін і паветаў, прыняты былі іх пастулаты. Мае ён таксама каардынацыйную функцыю, каб не быў у калізіі з цэнтральнымі і лакальнымі планамі ды намерамі.

Міра Лукша

Знаёмства з самаўрадавай дзейнасцю

Беларускі самаўрадавы форум з 29 чэрвеня па 2 ліпеня арганізаваў у Гайнаўцы стажыроўку для дэпутатаў самаўрадаў з Рэспублікі Беларусь. Беларускія госці спаткаліся з бурмістрам Гайнаўкі Анатолем Ахрыцюком, старшынёю Гарадской рады Якубам Астапчуком, старастам Уладзімірам Пятрочукам і старшынёю Рады Гайнаўскага павета Міколам Міхалюком. У час гэтых спатканняў знаёміліся яны з дзейнасцю самаўрадавых адзінак. Самым лепшым урокам быў удзел у сесіі Гарадской рады ў Гайнаўцы. Беларускія госці выслухалі дыскусію пра перспектывы турыстычнай дзейнасці ў Гайнаўцы. Прапанавалася стварэнне на акраінах горада воўчага парку, што зацікавіла беларускіх дэпутатаў.

— Нашыя ўлады глядзяць на новыя ініцыятывы як на ўмяшанне ў іх унутраныя справы. Чакаюць нас дэмакратычныя перамены з дэцэнтралізацыяй і прыватызацыяй. Трэба выкарыстаць польскі вопыт для іх прымянення і адначасна пазбегнуць памылак, якія былі ў Польшчы. Візіт у Гайнаўку дае магчымасць пазнаёміцца з самаўрадавай працай у вашай краіне, каб магчы выкарыстаць гэты вопыт у Беларусі, — заявіў Аляксандр Жучкоў, старшыня праўлення Грамадскага аб'яднання „Фонд імя Льва Сапегі", якога аддзяленні знаходзяцца ў многіх беларускіх гарадах. Фонд гэты дапамагаў самаўрадаваму форуму праводзіць набор на паездку ў Польшчу.

Спатканні з гайнаўскімі самаўрадаўцамі перапляталіся з дакладамі, якія адбываліся ў памяшканні Беларускага самаўрадавага форуму. Старшыня Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь Марцін Рэмбач расказаў пра дзейнасць няўрадавых арганізацый у Польшчы. Былая бурмістр Гайнаўкі, а зараз старшыня Таварыства сяброў Гайнаўкі Ядвіга Рудзінская-Патэюк выступіла з дакладам аб працы самаўрадаў. У сваім выступленні выкарыстала яны вопыт бурмістра і члена няўрадавай арганізацыі.

— У вас вядомыя правілы вырашання самаўрадавых праблем. У Беларусі мясцовая ўлада фактычна вертыкальная, падпарадкаваная прэзідэнту. Трэба, каб больш людзей выязджала ў Польшчу паглядзець самаўрадавую дзейнасць. Нам трэба ўбачыць, як памянялася ваша краіна пры рынкавай эканоміцы, — сказаў Юрый Зяньковіч, дэпутат Мінскага раённага і Ждановіцкага пасялковага саветаў.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Госці з Беларусі (першыя злева Аляксандр Жучкоў і Юрась Зянковіч) з арганізатарам Міхасём Андрасюком (першы справа)

Беларускіх дэпутатаў найбольш цікавілі спатканні ў самаўрадавых установах і няўрадавых арганізацыях. У павятовай управе працы знаёміліся з сістэмай дапамог па беспрацоўі і магчымасцямі працаўладкавання на гайнаўскім рынку. У Цэнтры еўрапейскай інфармацыі, Цэнтры прапагандавання прадпрымальніцтва і Цэнтры прапагандавання рэгіёна цікавіліся працай арганізацый, якія супрацоўнічаюць з самаўрадамі.

Мікола Аксаміт быў дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у 1990-1996 гадах. Праінфармаваў ён, што ў Беларусі быў уведзены закон аб мясцовым самакіраванні, які зараз прымяняецца ў абмежаваным выглядзе.

— Задача самаўрадавых дэпутатаў зведзена да дэкаратыўнай ролі. Могуць яны займацца справамі парадкавання вуліц і паляпшэння асвятлення. Патрэбная ў нас дэцэнтралізацыя ўлады. Мясцовыя людзі лепш ведаюць, што адбываецца ў іх асяроддзі і патрапяць лепш вырашаць свае праблемы, — заявіў Мікола Аксаміт.

У Белавежы дэпутаты пазнаёміліся з дзейнасцю агратурыстычных кватэр. Мелі яны нагоду пазнаёміцца з новымі турыстычнымі паслугамі, якія ў Беларусі вядомы толькі ў абмежаваным выглядзе. Мікола Цівончык з'яўляецца дэпутатам Белаазёрскага гарадскога савета. Яго горад асаблівы ў маштабе ўсёй Беларусі. На 13 дэпутатаў ажно 9 асоб незалежных ад прэзідэнцкай улады.

— Мэр горада выбраны ад прэзідэнцкай вертыкалі, але мы не мяняем яго. Зараз толькі вучымся, як кіраваць гарадам, а ён нам дапамагае, — сказаў Мікола Цівончык. — Сесія ў Гайнаўцы навучыла нас, што з некаторымі справамі радныя павінны пазнаёміцца раней.

Арганізатары мерапрыемства паказалі госцям Свята-Троіцкі сабор, Музей і асяродак беларускай культуры і запрасілі іх у Комплекс школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы. Дырэктар школы Яўген Сачко пазнаёміў дэпутатаў з працай школы і вучобай беларускай мове. Самаўрадаўцаў цікавілі ўмовы вучобы і працы настаўнікаў. Госці выявілі зацікаўленне супрацоўніцтвам з Гайнаўскім белліцэем.

Рэалізацыя праекта „Польшча — Беларусь, самаўрад па-над межамі" будзе працягвацца ў жніўні, паколькі зараз многія рады спыняюць працу. Плануецца, што тады прыедуць у вясковую гміну Гайнаўшчыны чарговыя госці з Беларусі. Праект мог быць рэалізаваны дзякуючы фінансавай падтрымцы Канцылярыі Старшыні Рады Міністраў у рамках тэхнічнай дапамогі дзяржавам, якія знаходзяцца на шляху трансфармацыі.

— Дзякуючы Фонду імя Льва Сапегі прыехалі да нас актыўныя самаўрадаўцы. Пасля гэтай міні-стажыроўкі бачым, што гасцям з Беларусі больш патрэбны жывыя кантакты з самаўрадавай дзейнасцю. Застаецца пасля іх больш вопыту і інфармацый чым пасля дакладаў, — сказаў Міхась Андрасюк, старшыня Беларускага самаўрадавага форуму.

Аляксей Мароз

Веласіпедам найлепш

Новыя веласіпедныя шляхі цераз Белавежскую пушчу былі адкрыты ў суботу 28 чэрвеня падчас зорнага злёту веласіпедыстаў з пушчанскіх мясцовасцей. Зялёным шляхам даўжынёю 41 км прыехалі веласіпедысты з Дубіч-Царкоўных і Белавежы. Блакітным шляхам прыбылі любіцелі веласіпедаў з Гайнаўкі, якія агулам праехалі 42 км.

— Веласіпедныя шляхі ў раёне Белавежскай пушчы налічваюць больш за 200 км. Праходзяць яны праз вясковыя тэрыторыі, а таксама натуральныя лясы Белавежскай пушчы. Пазапушчанскія тэрыторыі паражаюць лагоднасцю вясковых краявідаў і багаццем драўлянай архітэктуры. Асабліва цэннымі з'яўляюцца прасторавыя планіроўкі вёсак. Пастаўлены франтонамі да вуліцы дамы ствараюць прыгожы традыцыйны тып вёскі г.зв. „вуліцоўкі". Да самых каштоўных аб'ектаў архітэктуры і гісторыі належаць цэрквы, касцёлы, могілкі, каплічкі і крыжы. Прапануем развіццё веласіпеднага турызму ў найбольш каштоўных у Еўропе лясах пад лозунгам „Белавежская пушча для веласіпедаў", — сказаў Стэфан Якімюк, кіраўнік праекта Сусветны фонд у карысць прыроды „Белавежскі нацыянальны парк". Адкрыццё шляху ў Гайнаўцы адыблося пры ўдзеле ўлад горада і Гайнаўскага староства.

Пасля поўдня ўсе групы сустрэліся ля вогнішча ў вядомай пушчанскай мясцовасці Тапіла. Арганізатары падрыхтавалі гарохавы суп, бігас і каўбаскі. Кожны ўдзельнік рэйда атрымаў новы нумар газеты „У згодзе з натурай" і карту Белавежскай пушчы з веласіпеднымі шляхамі. Самыя актыўныя асобы, якія прычыніліся да добрай арганізацыі рэйда, атрымалі дыпломы з рук Гражыны Банцарэвіч з Сусветнага фонду.

Я лічу, што гэта не апошнія шляхі ў Белавежскай пушчы. Астаўляйце свае машыны ў Гайнаўцы, Белавежы, Нараўцы ці ў Дубічах-Царкоўных і сядайце на веласіпеды. Сапраўды варта. Да сустрэчы на шляху!

Славамір Кулік

Фота СЛАВАМІРА КУЛІКА

Адгалоскі

Атака на Сычэўскага

Прачытаў я артыкул Мацея Халадоўскага „Атака на Сычэўскага" („Ніва" № 26 ад 29 чэрвеня г.г.) і моцна над ім задумаўся. Найперш прыйшла мне ў галаву думка, чаму такіх радных як Зэнон Дзедзіц ад Лігі польскіх сем'яў не можа прытрымаць Маршалак Падляшскага ваяводства. Яны ж кампраметуюць нашу дзяржаву на вачах цэлага свету, зусім не саромеючыся.

Тут трэба сказаць праўду, што спадар Ян Сычэўскі ніколі не абразіў аніякай нацыі, ані этнічных груп пражываючых у Польшчы і ніколі дрэнна не адносіўся да іншых веравызнанняў. Ён толькі бароніць усе нацыянальныя меншасці пражываючыя ў дзяржаве.

З артыкула даведваемся, што радны Зэнон Дзедзіц на пачатку нападаў на Асяродак культуры „Пагранічча" ў Сейнах, потым клеймаваў жыдоўскую і нямецкую меншасці, а цяпер — калі наша краіна ўваходзіць у Еўрасаюз — пачаў нападаць на праваслаўных беларусаў — грамадзян Польшчы пражываючых тут ад вякоў.

Варта, каб усе радныя Падляшскага сейміка прызналі Зэнона Дзедзіца нягоднікам і схілілі яго да перапросін Яна Сычэўскага ды нацыянальных меншасцей пражываючых у нашай краіне.

Мікалай Лук'янюк

Будзе стаянка каля могілак

Сувальская філія Рэгіянальнага ольштынскага аддзела Агенцтва сельскагаспадарчай маёмасці казны ў адказ на заяўку войта Арлянскай гміны з 18 красавіка г.г. згадзілася бясплатна перадаць зямельны ўчастак у Рыгораўцах — велічынёй 0,72 гектара — для ўстаноўкі стаянкі каля тамашніх могілак.

Пра патрэбу ўстанаўлення стаянкі жыхары Рыгораўцаў заявілі салэцтву, якое з гэтай справай звярнулася да гмінных улад. Гэта будзе другая калямогілкавая стаянка ў гміне; першую годам назад вызначылі ў Орлі.

Міхал Мінцэвіч

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Навучэнцы Балетнага цэнтра выконваюць падляшскі танец

Вершы Віктара Шведа

Медыцына

Настаўнік запытаў Марціна,
Распачынаючы ўрок:
— Скажы, што гэта медыцына,
Як разумець яе, сынок?

— Навука маецца такая,
Усім вядома, не сакрэт.
Хворым яна дапамагае
Перабірацца на той свет

Малы газетчык

Малы газетчык нясе пад пахай
Процьму газет у часе раннім.
Раптам прахожы поўны жаху
Зрабіў малому шкадаванне.

— Ты перагружаны страшэнна,
Табе я надта спачуваю.
— Мяне вы дрэнна зразумелі,
Газет зусім я не чытаю.

Ніна Мацяш

Начныя свечкі

Па бары да самай рэчкі
паліць ноч „начныя свечкі".

Там гараць яны, бы ў залі,
каб казулькі не зблукалі,

ідучы да вадапою
цёмнаю начной парою.

„Начная свечка" — род раслін сямейства скрыпневых, тое што аслінік.

Мода на Падляшша

Усё часцей адзначаем сувязь з нашым рэгіёнам — Падляшшам. Гэта айчына беларусаў, палякаў, татараў, украінцаў.

Вяртаецца мода на падляшскую культуру, стравы.

Танцы і падляшскія спевы прадставілі навучэнцы Балетнага цэнтра ў Беластоку. У творы выступілі матывы польскіх і беларускіх танцаў: паланеза, лявоніхі, юрачкі. Прытым танцоры прэзентавалі падляшскія ўборы. Захапляюць яны сваёй каларыстыкай і багаццем аздобы.

Навучэнцы Балетнага цэнтра выступаюць ва ўсёй Польшчы і за мяжой. Раз у год ладзяць агляд сваёй творчасці ў Беластоцкім драматычным тэатры імя А. Вянгеркі, на які запрашаюць бацькоў і сяброў.

У Балетным цэнтры навучанне працягваецца восем гадоў (з першага па восьмы клас). Балетны цэнтр працуе ў будынку Музычнай школы, што па вуліцы Падлеснай.

Зорка

Марта

Марта Адамюк — вучаніца пятага класа Пачатковай школы ў Чыжах. Дзяўчынка выступіла на сцэне Нараўчанскага дома культуры з вершам Станіслава Шушкевіча „Не рашаецца задача".

У Марты было вялікае хваляванне. Першыя словы верша прагучэлі ціха-ціха. Аднак Марта перамагла хваляванне і далей дэкламавала ўпэўнена.

Дэкламацыя была ўзбагачана тэатральнымі жэстамі.

Вядома таксама, што Марта Адамюк старанлівая і працавітая дзяўчынка, яна без дапамогі іншых рашае ўсякія задачы.

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Славік-маладзец

(паводле беларускай народнай казкі)

Славік трыццаць гадоў не хадзіў — сядзеў у пасцелі, асуджаны цалкам на волю бацькоў. І ногі, і рукі ў яго былі такія — ну, нічога не можа. Трыццаць гадоў маці карміла сына, прыбірала за ім.

Аднойчы ў дом завіталі вандроўнікі.

— Добры дзень, добрыя людзі!

— Добры дзень!

— А, ці не знойдзецца ў вашай хаце кубак вады і луста хлеба?

— Ой, і віно ў нас знойдзецца добрым людзям.

Селі. Гаспадары ўгасцілі іх усім найлепшым што было ў хаце: вэнджаным кумпяком, кілбасамі, хрэнам выкапаным перад першым громам, салёнымі баравікамі, віном.

— А што гэта ў вас хлопец такі на пасцелі? — спытаў адзін госць. Вандроўнікі ведалі пра хворага Славіка, яны і спецыяльна прыйшлі ў гэтую хату.

— Ах, мілыя, — расплакалася маці, — ён ужо трыццаць гадоў так сядзіць і мучыцца. І яму, і нам душа ад жалю ные.

Вандроўнікі перакінуліся між сабой зрокам і кажуць:

— Дайце, гаспадыня, нам дзве чаркі віна.

Вандроўнікі ўзялі пітво і падышлі да пасцелі.

— За здароўе, — сказаў адзін госць і падаў Славіку шклянку віна.

— Напіся і ад мяне, — падаў чарку другі.

Вандроўнікі зноў пераглянуліся між сабой.

— А цяпер уставай з пасцелі! — загадалі калеку. — І хадзі да стала, закусі.

Славік устаў на ногі, шлёп, шлёп, шлёп... і дайшоў.

— А ў вас камора ёсць? — спытаў вандроўнік.

— А як жа, ёсць.

— А меч ёсць?

— Ёсць.

— Ідзі тады, Славік, і прынясі нам той меч.

Хлапец, на здзіў бацькам, пайшоў і прынёс меч. Не жарты, трыццаць восем пудоў меч важыў. Хлапчук быццам асілак узяў яго ў адну руку, адышоў за хату і шпурнуў у неба.

— Брава! — усклікнулі вандроўнікі.

Дзве гадзіны чакалі ўсе, пакуль меч з неба вярнуўся. Хлопец выцягнуў яго з зямлі, а ён ясны і бліскучы стаў.

— Ну вось! Нам ужо пара, — развіталіся незнаёмыя і пайшлі ў свой бок.

У той час у Княстве ўспыхнула вялікае гора. Па дарозе з Кіева ў Бельск, сярод лясоў і балота стаяў сярод дарогі дуб, на дубе Салавей-злачынца пасяліўся. Хто ні едзе,

Кветка шчасця

Няма чаго шукаць папараць-кветку, кветку шчасця. Толькі так сабе разбягаюцца па ўзлесках людзі ў купальскую ноч, наскакаўшыся праз агонь, ачысціўшыся — шчаснай кветкі шукаюць. Каб мары здзейсніліся. Вядома, легендарная гэта кветка, казачная, і, мабыць, ніхто яе і не знайшоў, і не знойдзе. А ў казцы, як у казцы, і падзеі, і героі, і цуды для таго, каб патлумачыць жыццё, сказаць праўду пра тое, што шчаслівы той, у каго ёсць сэрца добрае і сябры. З імі не прападзеш. І шчаслівы ты, калі сваім шчасцем, радасцю можаш падзяліцца...

Усе ведаюць, што папараць не заквітае яркай, райскай кветкай, а мае свае „кветачкі", чорныя значкі, адмыслова прыдуманыя прыродай дзеля размнажэння. Але кожны хоча знайсці сваю кветку мараў. Дык бягуць усе ў яе пошуках, з крыкам і смехам, у гарачую купальскую ноч...

Найцікавей шукаць кветку разам. І не так страшна. У гэтае Купалле Юста выбралася з Ялінкай, сяброўкай. Можа і не сяброўка яна, а, проста, аднакласніца. Недалёка, у суседнюю вёску. Юста і Ялінка — ужо ў другім класе гімназіі. Калісьці гэта быў бы восьмы клас, апошні ў пачатковай школе. Юсціна мама кажа, што калісьці восьмы клас — гэта ўжо былі дарослыя людзі. Сама памятае. Але калі дзяўчаткі выбіраліся на Купалле, дык прыгразіла пальцам: „Дзяўчаткі, глядзіце!" Дзяўчаткі, дзіцяткі! — калі што, дык не думай сваім розумам, а слухай дарослых!

— Знойдзем свае кветкі шчасця!

— Яшчэ чаго вам бракавала! Не ідзіце толькі ў лес! Панаязджае ўсялякіх, чужых... Трымайцеся вогнішча!

Вядома, калі трымацца гурту, дык будзеш ісці дзе ўсе. А кожны сваё шчасце знаходзіць сам, індывідуальна. Бо шчасце, яно ў кожнага іншае. Дык рушылі, пасля канцэрта ды скокаў, дзяўчаткі ва ўзлесак, трымаючыся за рукі.

— Глядзі, свеціцца.

— Дзе?

— А вунь там! Свеціцца... Трапечаца! Папараць-кветка! — Юсце аж заняло дых. Паміж галінак мільгала-пералівалася штосьці далікатна-каляровае. Як забіліся сэрцы ў дзяўчатак! Сарваць тую краску, прытуліць да сэрца!

А тут і не кветка, і ніякае не шчасце. У кустах стаяў Петрык, вядомы ў школе як „Няшчасце", якога ўсе мелі за неўдалоту. Ціхманы, павольны. Маўклівы — як азвецца сярод калег, дык як што ўпора... Праўда, вучыцца няблага, але такі сябра патрэбны толькі для падказак... А ў руках у яго — звычайны пруцік-светлячок.

— А вы нічога і не кажыце! — адважна гукнуў Петрык-Няшчасце. — У вас шчасце, што мяне знайшлі!

А і праўда! Такога выдатнага сябру адкрылі дзяўчаты! А і яму пашчасцілася! Цяпер іх — не разліеш вадой! І разам у ліцэй выбірацца будуць. У гайнаўскі, беларускі.

Міра Лукша

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Дзіцячыя вячоркі" ў выкананні вучняў з Орлі

„Дзіцячыя вячоркі" ў Орлі

— Калі вераб'і пералятаюць з месца на месца — чакайце ветру, — так цікава павучаюць нас са сцэны маладыя акцёры.

Менавіта народныя павер'і, прыказкі і прымаўкі, анекдоты і гульні склалі аснову сцэнарыя спектакля „Дзіцячыя вячоркі". Падрыхтавалі яго малодшыя выхаванкі Яўгеніі Тхужэўскай з Орлі.

Дзея адбываецца яшчэ ў датэлевізійныя часы, калі людзі — старыя, маладыя, дзеці — жывуць прагай сустракацца. У кожнай сустрэчы свой няпісаны сцэнарый, людзі сустракаюцца, каб чамусьці навучыцца, разам адпачыць пасля працы. Старэйшыя вучаць моладзь народных мудрасцей, перадаюць ім стыль паводзін. У кампаніі заўсёды пажаданыя актыўнасць і гумар. Калі ты ў групе — адкрывайся на свайго сябра. Супольная гульня магчымая толькі ў супольнай шчырасці, брацтве. Колькі радасці прыносіць нам супольнае спяванне! (акцёры спяваюць беларускую песню „Ой, сівы конь бяжыць"). Або тэст на кемлівасць пад выглядам гульні ў загадкі. Усё гэта закранулі і цікава паказалі арлянскія навучэнцы.

Спектакль разыграўся на фоне сцэнічнага афармлення, якое дзеці выканалі разам з настаўніцай. Гэта вясковая хата з традыцыйнымі аздобамі: вышыванымі ручнікамі і абрусам, тканымі дыванамі, мэбляй з бярозы. Акцёры таксама прыдбалі сабе вышываныя кашулі і стылізаваныя на народны лад касцюмы.

У пастаноўцы выкарыстаны звычаі з наваколля Орлі, таму п'еса гучыць свойска і сантыментальна. Вядома, старэйшаму гледачу, які памятае яшчэ такія вячоркі са свайго жыцця.

Зорка

хто ні ідзе, салавей як свісне — голасам забівае!

Сеў Славік на каня і паехаў у Кіеў. Едзе, едзе, да дуба пад'ехаў... Салавей тут як свісне, кабылка аж на калені ўпала.

— Чаго ты, травяны мех, воўчае мяса, на калені падаеш? Баішся мяне? — смяецца разбойнік.

Славік пад'ехаў бліжэй, — салавей з дуба злятае. Як свіснуў!

— Не, галубчык, — кажа маладзец, — так у нас не свішчацца ў Бельску.

І як наш Славік свіснуў, салавей на зямлю паваліўся. Узяў бяспутнага маладзец за шыю, зачапіў за сядло і да цара ў Кіеў павёз.

У Кіеве цар пытае:

— Ну, як жа ты, хлопец, прыехаў?

— Ехаў сабе, нікога не бачыў, ні з кім не вітаўся.

— А што ў цябе за сядлом?

— Птушка.

— Якая птушка?

— Салавей-злачынца, што свістам забіваў.

— Не маніш, малойчык? А ну, давай, хай ён свісне.

Славік загадаў:

— Толькі напаўсілы голасу запей!

Як салавей свіснуў, цар на сваім балконе ўпаў. Пасля ўстаў і загадаў:

— Злачынцу пакараць, а маладца на пасад саджаць!

Славік не хацеў усяго царства. Ён вярнуўся дахаты, са славай і куфэркам золата. Бацькам на старасць служыць, сваю сям'ю нажываць і гадаваць.

(гак)

Радаслаў

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Выступленні многіх дэкламатараў насычаныя вялікай эмацыйнасцю. Слухач любіць такія моманты на сцэне. Яны кранаюць, прымушаюць задумацца. Аднак такія выступленні найлепш успрымаць у камернай групе. Тады магчымы энергетычны абмен паміж акцёрам і публікай.

Радак Андраюк — гімназіст-першакласнік бельскай „тройкі". Ён падрыхтаваў верш Кастуся Кірэенкі „Засінела неба, засінела".

Лірычны твор удала спалучаўся з уражлівым выкананнем. Аднак уся прыцягальнасць выступлення разбівалася аб вялізныя сцены і нервовасць выступаючых. Сярод публікі, як вядома, пераважала канкурэнцыя.

Зорка

Польска-беларуская крыжаванка № 29

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 25: Афра, кошка, стан, клас, рак, напрамак, нота, курс, хатка. Знак, нос, штопер, фантан, мох, крата, плакат, вясёлка.

Узнагароду — **кніжку Уладзіміра Арлова „Адкуль наш род"** — выйграў **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!

Сядзела на рынку, прадавала макі, як не мела рэшты, то давала...

Фрывольныя спеўкі ў Чорнай

На першае выданне фестывалю „Kresowa przyśpiewka ludowa" ў Вясковым доме культуры ў Чорнай-Весі-Касцельнай з Беластоцкага павета прыехала 13 калектываў. Папраўдзе, большасці жанчынам, здаецца, цяжкавата прыходзілася з уцехай праспяваць „салоныя" кавалкі, вельмі папулярныя ў застоллі ці ля вогнішча, ды не ў культурным „казённым доме". Спявалі тое, што іграе ў душы, якая не старэе.

— Агляды фальклорнай песні проста выпакладаны цэнзурай з моцных, смачных тэкстаў, — кажа Яніна Чыжэўская, адна з арганізатарак агляду, з павятовага староства. — Калі агляд канчаўся, усе былі ўжо расслабленыя, аказалася, што ўсе ведаюць мноства фрывольных, прыгожых спевак, глыбока ўкарэненых у народнай традыцыі. Ідэя нарадзілася пасля ўсіх папярэдніх аглядаў. Людзі саромеліся спяваць такія песні — „не выпадала". Трэба было доўга працаваць з калектывамі, каб пераканаць, што якраз тыя арыгінальныя спеўкі не распусныя ці непрыстойныя, грубавата-вясёлыя, а сапраўдны, жывы фальклор, не ачышчаны вучонымі фалькларыстамі і этнографамі.

— Гэта, здаецца, адзіны фестываль такога тыпу ў Польшчы, арганізуем яго першы раз, ды маем надзею, што ў будучыні будзе ён цыклічным мерапрыемствам, — запэўніла дырэктарка ВДК Альжбета Камянчук. — Будзем старацца арганізаваць яго ў першую нядзелю ліпеня, калі не тут, дык у гміне, мабыць, над вадой, што магло б сабраць больш гледачоў.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Узнагароджаны — Гарадок

Можна было таксама паглядзець працэс вырабу і творчасць народных мастакоў са Шляху „Народнага мастацкага рукадзелля Падляшша" ў кавальскай майстэрні спадара Гулевіча і ганчарскіх Кудрэвіча і Пяхоўскага.

Першым паявіўся на нядзельна апусцелай ліпеньскай вуліцы Вясёлай у Чорнай вясёлы гурт з Тыкоціна, „Гетманкі". Пажылыя дамы ў цёмна-вішнёвых касцюмах, з чорнымі карункамі на саянах, з чырвонымі каралямі ды прыгожа гафтаванымі каўнерамі блузак (*pięknу haft zależy od tego, co się pije*, жартавалі) прывезлі былі сур'ёзны матэрыял, ды вясёлыя кабеткі хутка яго змянілі і праспявалі м.інш. пра гандлярку макамі, ужо пасля пару меланхалічных пенсіянерскіх выступленняў на галасы. Гэта выклікала вялікую радасць і ажыўленне сярод публікі ды журы (Яніна Чыжэўская, Галена Мяшкунец ды Багдан Дудко). Пасля пайшло-паехала! З поўнай дозай эротыкі ды больш далікатнымі і незаўважнымі на першы слых нотамі фрывольнасці. Гаспадары, вядомая чорнавеская капэла „Чарнавяцы" пяялі пра такога пташачка, што *na dwóch jajkach siedzi, dobze mu się zyje, jak zobacy babę, to wyciąga syję!*, з дакладным ды паэтычным апісаннем выгляду таго цуда. Але трапіліся невядома адкуль і трагічная „Падалянка" ў выканнні „Угавянак" з Угова, і „Вячэрні звон" „Нарвянак" з Крушэва... Сапраўды, з фрывольнымі спяванкамі выступілі, за „Чарнавякамі", перш за ўсё „Клепачанкі" з Клепачоў (яны заўважылі, *w przyśpiewkach to się różnie zdarza — jeden się ucieszy, a drugi obraża*) ды беларускія гурты — „Каліна" з Залук ды капэла „Хутар" з Гарадка. „Расспяваны Гарадок", які ўзяў першую ўзнагароду, таксама часткова змяніў рэпертуар, але „фрывольнасці" хапіла і ў цэлым канцэрце, які ён даў, паваліўшы на калені канкурэнцыю галасістасцю, сцэнічным рухам, агульным вобразам ды тэмпераментам выступоўцаў. Узнагароду ўзяла і гарадоцкая салістка Марыя Врублеўская. На другім месцы апынуліся тыкоцінскія „Гетманкі", на трэцім — „Чарнавяцы". Вылучаны былі „Нарвянкі" з Крушэва ды свежы гарадоцкі „Хутар".

Спевакоў і гледачоў прагнаў ад вогнішча, якое завяршыла агляд, кароткі спорны дождж. Чамусьці больш не спяваліся „салоныя кавалкі". Мабыць, у наступны раз будзе сапраўды фрывольна, і ўзнагарод будзе больш, ці падзелены яны будуць больш справядліва (на думку неўзнагароджаных). Ды каму дагодзіш — ці на сцэне, ці на сене!..

Міра Лукша

Скупаўская Ноч Купалы

Краіна шчасця поўная чараў

Падчас поўнай магіі і чараў Ночы Купалы нарадзілася на Беласточчыне Краіна шчасця. Выявілася з незвычайнай імглы і непаўторнай ночы, а яе заснавальнікам ды вартаўніком-наглядчыкам стаў Славамір Галёнка з Цэнтра нацыянальнай творчасці.

Вечарам 6 ліпеня многа аўтамабіляў імчала на Купалле ў Белавежу. Выбраўся туды і я. Еду з Новага Ляўкова ў Гайнаўку. Пачынае цямнець ужо за Нараўкай. На шашы вялікі рух. Людзі едуць хто куды: адны на Купалле ў Стары Двор на Семяноўскае вадасховішча, іншыя ў Белавежу. Даязджаю да Скупава. Бачу новы дарожны ўказальнік „Краіна шчасця" — направа. Павярнуў я ў бок. Пад'язджаю да брамы, паверх якой надпіс „Слаўконія". Тут прывітаў мяне Славамір Галёнка (творца экзатычнай краіны) і ўсё высветліў. Трапіў я добра. Неўзабаве афіцыйнае адкрыццё Краіны шчасця на плошчы аднаго гектара, на ўскраіне Белавежскай пушчы. Тут вельмі прыгожае месца: у засені дрэў ставы.

І пачалося. Арыгінальныя ўборы ўдзельнікаў сустрэчы падкрэслівалі магніт моманту-хвіліны. Усе рушылі на бераг става, асветленага факеламі. На драўляным мосціку ў бляску паходняў уцягнулі на мачту „афіцыйны" сцяг Краіны. Прачыталі таксама яе заснавальніцкую легенду, якая стылем і формай нагадвала славянскія паданні.

„Вось глядзіце, штосьці дзеецца. Бачу імглу дзіваў сённяшняй Купальскай ночы. Радуймася, бяседуйма-балюйма і танцуйма. Краіна шчасця жыве. Сёння яна нарадзілася. Гэта мы з'яўляемся ёю", — так гучаў фрагмент заснавальніцкай легенды прачытанай Стэфанам Крулем.

Паколькі заснаванне Краіны супала ў часе з Ноччу Купалы — не магло абысціся без пускання вянкоў на ваду. Але перад гэтым з мосціка-сцэны паплылі беларускія песні ў выкананні „Нараўчанак" з Нараўкі. Звонкае рэха плыло далёка па пушчы. На сцэну выйшлі Алег і Іаланта Кабзары з гітарай. Мілагучна праспявалі „Купалінку", „Касіў Ясь канюшыну", „Ой, ляцелі гусі з броду", „Ой, ты вярбонька, кучаравая" і „Цячэ вада ў ярок".

Сышлі яны са сцэны і ўсе пачалі пускаць вянкі на ваду. На кожным вянку свечкі. Дзяўчаты ўпрыгожылі свае галоўкі вяночкамі з пахучых зёлак ды белых рамонкаў, блакітнавокіх васількоў і пурпуровых гераняў...

Калі ўсе прахаджваліся над вадою, гаспадар запрасіў на вячэру. З магнітафоннай стужкі плылі беларускія песні ў выкананні калектыву „Ас".

Пасля пусцілі аўдыёвізуальны спектакль — дыяпарамы Кшыштафа Блёха „Настроі ператварэнняў", „Каханні" і „Танец цішыні", які аб'ядноўваў вобраз, гук, колер і змест.

У 11 гадзін вечара пад'ехаў аўтобус і ўсе адправіліся на Купалле ў Стары Двор на Семяноўскае вадасховішча. Гулялі да гадзіны першай ночы. Вярнуўшыся грамадзяне Краіны шчасця (ім выдалі спецыяльныя пашпарты) зноў заселі за стол. Елі і пілі, хто гарбату, а хто каву. Імпрэза закончылася на світанні танцамі пад гукі гармоніка Яна Яканюка.

Янка Целушэцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Віктар Кабац побач сваіх эскізаў і разьбы па дрэве

Заклік пушчы

У Прыродазнаўчым музеі ў Белавежы працуюць выстаўкі карцін Віктара Кабаца і разьбы па дрэве Уладзіміра Мусько, якія раней паказваліся ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы.

— У гэтым агромным лесе жыве якісьці дзіўны дух. Ён спадарожнічае людзям, якія без пілы і сякеры ўваходзяць у глыб лесу. Пачуць заклік пушчы — вялікае шчасце, — заяўляюць аўтары работ Уладзімір Мусько і Віктар Кабац. — Выстаўка толькі дакранаецца да лясной таямніцы.

Уладзімір Мусько першы раз рашыўся паказаць сваю разьбу, якую выконвае па каранях дрэў. Знаходзіць іх на тарфяніках побач Міхалова. Хаця карані доўгі час ляжалі ў торфе, захавалі добры, арыгінальны выгляд. На выстаўцы найбольш выяваў птушак і звярыных матываў. Аднак цяжка дакладна акрэсліць да чаго падобныя некаторыя абстрактныя работы Уладзіміра Муські. Адна асоба можа ўбачыць на іх ластаўку, другая — бусла. Спадар Мусько доўга перабірае карані, каб знайсці цікавыя матывы. Пасля найчасцей абмяжоўваецца да абразання кончыкаў і кансервацыі карэння. Нават сасновыя карані, пасля доўгага знаходжання ў торфе, становяцца цвёрдымі і цёмнымі. Магчыма, што тысячы гадоў чакалі яны абуджэння і новага жыцця.

Віктар Кабац паказвае эскізы да карцін аб Белавежскай пушчы. Гэта рысункі тушшу і каляровымі фламастэрамі на мокрай паперы. Побач сасны паказаны на выстаўцы елкі і бярозы, якіх многа ў Белавежскай пушчы.

— Спачатку ў лясной рачулцы мачу паперу, а пасля бяруся за выконванне сваіх работ. Калі няма лясной вады, карыстаюся гарадской, прывезенай у бутэльках, — кажа Віктар Кабац. — Мы з Уладзімірам Мусько хацелі паказаць духоўнасць пушчы, у якой другое жыццё, другі свет. Пушча багатая дзякуючы драўніне, ягадам і грыбам. Але ёсць яшчэ духоўнае багацце, якое паказваем на выстаўцы.

Дэбют Уладзіміра Мусько можна лічыць удалым. Наведвальнікі выстаўкі зацікаўлены яго работамі і хочуць купіць іх. Аўтар разьбы раней вучыў гісторыі і быў дырэктарам Падставовай школы н-р 2. Тадэвуш Маркевіч, адзін з лепшых разьбяроў па дрэве ў Польшчы, вельмі высока ацэньвае працы Уладзіміра Мусько, бо кожная захоўвае сваю непаўторнасць.

Працы гайнаўскіх мастакоў можна будзе глядзець да 10 верасня.

Аляксей Мароз

Біблія Францыска Скарыны выйшла ў Германіі

Размова з каардынатарам беларуска-нямецкіх культурных сувязей, асацыяваным прафесарам Бонскага універсітэта Уладзімірам Сакалоўскім.

— На старонках беларускай прэсы з'явіліся паведамленні пра новае неардынарнае выданне-выпуск чарговага тома „Біблія славіка", які ўбачыў свет у Нямеччыне. І на гэты раз том прысвечаны Скарыне. Так?

— Сапраўды, у Нямеччыне ў аўтарытэтным выдавецтве Фердынанда Шонінга ўбачыў свет новы том пад назвай „Біблія Руска. Выложена доктором Францiском Скорыною. Прага 1517—1519". Гэтае аб'ёмнае ў 1055 старонак выданне здзейснена ў рамках трэцяй „усходнеславянскай серыі" вядомай нямецкай комплекснай праграмы па славістыцы — „Біблія славіка".

— А што ўяўляе сабою славістычная праграма „Біблія славіка"?

— „Biblia Slavica" — гэта комплексная праграма, заснаваная ў прыканцы 80-х гадоў з мэтай выдання найбольш знакамітых помнікаў славянскіх культур старажытнасці. Яна выдаецца вядомымі нямецкімі славістамі Гансам Ротэ (Бон) і Фрыдрыхам Шольцам (Мюнстэр). Складаецца гэтая праграма з 6 серый: чэшскай, польскай, усходнеславянскай, сербалужыцкай, харвацкай і дадатковай — літоўскай. У III серыі „Усходнеславянская Біблія" напачатку было запланавана выданне двух выдатных помнікаў беларускай старажытнай культурнай спадчыны — Бібліі Францыска Скарыны і Астрожскай Бібліі. Аднак жыццё ўнесла свае карэктывы. У сувязі з выпускам 3-томнага факсімільнага выдання Бібліі Скарыны ў Беларусі (1990-1991) нямецкія славісты адмовіліся ад першапачатковай задумы і распачалі падрыхтоўку тома каментарыяў.

— Як ажыццяўляўся выпуск гэтага вядомага выдання?

— Гісторыя гэтага выдання даволі складаная і працяглая. Яна ахоплівае больш за 10 гадоў і сягае ў 1990 год, калі падчас Міжнароднага сімпозіума „Беларусь і Захад" (Мюнстэрскі універсітэт) вядомы нямецкі славіст Г. Ротэ звярнуўся да мяне, а я тады быў загадчыкам сектара ўзаемасувязяў літаратур АН БССР, з прапановай аб дапамозе ў выданні Бібліі Ф. Скарыны ў комплекснай праграме „Біблія славіка" і тома грунтоўных каментарыяў да яе. Аднак у сувязі з тым, што ў Мінску ўжо (як адзначана вышэй) распачалося такое выданне, з запланаванага заставаўся толькі том каментарыяў.

На працягу 1991-1992 гадоў быў сфармаваны сталы калектыў аўтараў і канчаткова вызначана тэматыка і структура будучай кнігі, а напрыканцы 1993 года матэрыялы яе былі перададзены нямецкаму боку. Працягласць працы над кнігай была абумоўлена тым, што ў Нямеччыне не так лёгка было знайсці высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне скарыназнаўства, а таксама спрактыкаваных перакладчыкаў з беларускай, асабліва старабеларускай мовы. І тым не менш, кніга пабачыла свет.

— Што ўяўляе сабой гэтае саліднае выданне?

— Выданне складаецца з дзвюх частак: першая — гэта каментарыі да трохтомнага выдання Бібліі Францыска Скарыны ў Беларусі, якое ўбачыла свет у Мінску пад назвай „Біблія руска. Выложена доктором Францiском Скорыною. Прага. 1517-1519. Каментарыі". Другая — гэта факсімільнае выданне аднаго з твораў беларускага першадрукара, што пададзены пад назвай „Апостал. Вільна. 1525. Факсіміле і каментарыі".

Першая частка, што складаецца з сямі грунтоўных раздзелаў, падрыхтавана вядомымі беларускімі навукоўцамі: А. Жураўскім, У. Конанам, І. Саверчанкам, Г. Галенчанкам, А. Шматавым і У. Свяжынскім. Выданне гэтай часткі рыхтавалася непасрэдна пад маім кіраўніцтвам. У ім таксама прыняў удзел вядомы даследчык беларускай літаратуры ў Англіі Арнольд Макмілін. А напачатку падаецца невялічкае ўступнае слова Адама Мальдзіса.

Каментарыі гэтага саліднага выдання прысвечаны ўсебаковаму аналізу важнейшых аспектаў выдатнага помніка беларускай рэнесанснай думкі — Бібліі Ф. Скарыны. Акрамя таго ў ёй багата і ўсебакова асветлена дзейнасць геніяльнай асобы беларускага першадрукара, шырока раскрыты яго гуманістычны светапогляд, асветніцкі характар яго выдавецкай дзейнасці.

Шмат увагі ў гэтай частцы аддаецца характарыстыцы выданняў Скарыны, якія для свайго часу былі шэдэўрамі паліграфічнага майстэрства, пераканаўча даводзіцца, наколькі тактоўна і ўмела Скарына выкарыстоўваў выдавецкія традыцыі, якія склаліся ўжо ў свеце, Заходняй Еўропе, асабліва ў Германіі.

— А што ўяўляе сабою другая частка выдання?

— Другую частку кнігі складаюць факсімільныя тэксты „Апостала", выдадзенага ў Вільні ў 1525 годзе, які тут узнаўляецца ўпершыню. Выданне нямецкіх славістаў Г. Ротэ і Ф. Шольца будзе спрыяць больш шырокаму знаёмству сусветнай грамадскасці са спадчынай выдатнага беларускага першадрукара. Да „Апостала" падаецца кампетэнтны каментарый Г. Ротэ пад тытулам „Апостал. Вільна. 1525. Яго даследаванні і крыніцы". Нямецкі славіст вельмі ўважліва і асцярожна падышоў да пытання доследу тэкстаў, якія выкарыстоўваў Францыск Скарына для перакладу „Апостала" на старабеларускую мову, пытання, што заблытана напластаваннямі шматлікіх супярэчлівых поглядаў. Г. Ротэ на працягу больш пяці гадоў падрабязна даследаваў паходжанне шматлікіх выразаў і асобных слоў, каб пераканаўча даказаць, якімі тэкстамі заходнееўрапейскімі (старажытнагрэчаскімі, лацінскімі) ці славянскімі (чэшскімі, польскімі, царкоўнаславянскімі) карыстаўся Ф. Скарына пры перакладзе „Апостала" на старабеларускую мову.

— Як ацэньваеце значэнне гэтага выдання?

Выданне нямецкіх славістаў і беларускіх навукоўцаў мае непераходнае значэнне, асабліва для замежнага чытача, яно дапамагае яму больш шырока выявіць і яшчэ паўней раскрыць усю веліч і значэнне Скарынавай спадчыны і па-сапраўднаму ацаніць яго геніяльны ўклад у развіццё культуры Усходняй Еўропы.

Адметным для гэтага выдання з'яўляецца тое, што ў каментарыях выкарыстаны самыя апошнія, навейшыя дасягненні не толькі беларускага, але і еўрапейскага, больш таго, сусветнага скарыназнаўства.

— А ці прадоўжыцца выданне іншых старажытных помнікаў беларускай культуры ў гэтай знакамітай комплекснай праграме?

— Так. Беларуская тэматыка моцна зацікавіла прафесара Ротэ, і зараз у партфелі „Біблія славіка" знаходзяцца яшчэ два значныя выданні беларускай культуры Адраджэння — „Катэхізіс" Сымона Будная і „Евангелле" Васіля Цяпінскага, якія паступова рыхтуюцца да выдання.

Гутарыў Сяргей Чыгрын

Кніжка-юбілярка

Георгій Карцоў усяго толькі тры разы наведаў Белавежскую пушчу, а пакінуў па сабе твор, які па сённяшні дзень лічыцца адным з найвыдатнейшых выданняў аб белавежскай жамчужыне. Яго кніжка выйшла ў палове 1903 г., мабыць да прыезду ў пушчу на чарговае паляванне цара Мікалая II, з сям'ёй і гасцьмі. Значыць, ёй роўна сто гадоў. Загаловак кніжкі „Беловежская пуща. Ея исторический очерк, современное охотничье хозяйство и Высочайшія охоты в Пуще". Друкавалася яна ў Пецярбургу ў Артыстычным выдавецтве А. Ф. Маркса, якое ў той час карысталася найбольш сучасным літаграфічным абсталяваннем.

Кніжка пабачыла свет у дзвюх выдавецкіх версіях. Раскошная версія мае цёмназялёны саф'янавы пераплёт. Больш скромнае выданне пакупнікі пераважна давалі да пераплёту, але ўжо на свой кошт. Якім тыражом выйшла кніжка — невядома. Вядома толькі, што яна зараз вялікі рарытэт. У самой Белавежы знаходзяцца ўсяго два экземпляры, абодва ў навуковых бібліятэках. Некалькі экземпляраў маюць таксама гайнаўскія кнігалюбы. Я сам, хаця за гэтай кніжкай хаджу амаль палову свайго жыцця, ніяк не магу яе здабыць. На аўкцыёнах паяўляецца спарадычна, з пазыўной цаной каля адной тысячы злотых, якая падбіваецца ў торгах не менш чым удвая.

У сваёй кніжцы Г. Карцоў прывёў весткі аб Белавежскай пушчы, якія пазбіраў па розных выданнях, вылавіў ва ўрадавых архівах, а таксама такія, якія ўдалося яму запісаць самому падчас кароткіх знаходжанняў у пушчы. Гэтак узнік твор магутны не толькі па свайму аб'ёму, але і па змесце. Кніжка па сённяшні дзень лічыцца вельмі багатай ведамі крыніцай аб прыродзе пушчы, яе гісторыі, паляўнічай гаспадарцы і царскіх ці вялікакняжацкіх паляваннях. Не сустрэнецца хіба ніводнай навуковай ці папулярнай працы, у якой аўтар, пішучы аб пушчы, не спасылаўся б на твор Г. Карцова. А нават калі і не спасылаецца, то знаўцу белавежскай літаратуры няцяжка прыходзіцца вылавіць фрагменты тэксту, якім крыніцай з'яўляецца згаданая кніжка.

„Белавежская пушча" Г. Карцова праілюстравана дзвюма сотнямі здымкаў і малюнкаў. Далучаны да яе таксама дзевяць картаў і чатыры планы. Частку здымкаў выканаў сам Г. Карцоў, апошнія: А. Д. Далматаў, А. А. Гал, Ган і Карасік. На адным са здымкаў відаць аўтара кніжкі на фоне царскага палаца ў Белавежы. Гэта, мабыць, адзін вядомы здымак з ім. Малюнкі змешчаныя ў кніжцы ўзніклі ў мастацкіх атэльле найвыдатнейшых тагачасных рускіх мастакоў: М. А. Зычы, К. Я. Крыжыцкага, В. І. Навозава, Н. С. Самокіша, Р. Ф. Фрэнца і А. С. Хрэнава.

Беларускае выдавецтва „Ураджай" у мінулым годзе падрыхтавала з нагоды юбілею другое выданне кніжкі Г. Карцова, азагалоўленай „Беловежская пуща 1382-1902". Яна, на жаль, меншая памерамі і мае намнога горшае графічнае афармленне. Навуковы супрацоўнік Нацыянальнага парку ў беларускай частцы пушчы, Вячаслаў Семакоў, напісаў быццам працяг твора Карцова. Яго кніжка, якую выдала ў той самы час тое ж самое выдавецтва, носіць загаловак „Беловежская пуща 1902-2002".

Пра аўтара славутай кніжкі да нядаўна яшчэ не было нічога вядома. Яго лёсамі пацікавіўся свайго часу В. Семакоў. Рэзультат сваіх пошукаў прадставіў ён у „Лесном Вестнике" (№ 2 ад 2001 г.).

Георгій Карцоў нарадзіўся 10 верасня 1861 г. Яго бацькам быў герой турэцкай вайны, генерал і вайсковы пісьменнік Павел Карцоў, аўтар кніжкі „Из прошлого". Георгія і яго брата ў снежні 1870 г. прынялі ў элітны юнкерскі корпус. Георгій ішоў па ступнях афіцэрскай драбіны ўсяго да верасня 1886 г. Менавіта тады яго ў званні паручніка перанеслі, па прычыне хваробы вачэй, у запасную гвардзейскую конніцу. Неўзабаве Георгій пачаў чыноўніцкую кар'еру. У снежні 1889 г. Карцоў стаў тытулярным саветнікам, а ў красавіку 1890 г. чыноўнікам па спецыяльных даручэннях царскага двара ў Міністэрстве ўнутраных спраў.

Служачы яшчэ ў юнкерскім корпусе, Г. Карцоў зацікавіўся выкарыстоўваннем сабак на паляваннях. Заняўся іх дрэсіроўкай, дабіваючыся за даволі кароткі час славы выдатнага спецыяліста ў гэтай сферы. Лёс сутыкнуў Карцова з Уладзімірам Дзіцам, кіраўніком царскіх паляванняў у Гатчыне, які запрапанаваў яму ўзяць апеку над царскай сабакарняй, у якой знаходзілася звыш ста сабак. Праз нейкі час Г. Карцоў пазнаёміўся з князем Дзмітрыем Галіцыным, кіраўніком царскіх паляванняў у розных закавулках імперыі, у тым ліку і ў Белавежскай пушчы. Гэта дзякуючы яму Карцоў упершыню трапіў у славутую пушчу. Ён проста ёю зачараваўся і пастанавіў напісаць аб ёй кнігу.

Аўтар „Белавежскай пушчы" пастаянна і ўважна сачыў за навінкамі ў гадоўлі і дрэсіроўцы сабак. Часта выступаў як галоўны суддзя расійскіх і замежных сабачых гонак, удзельнічаў у замежных выстаўках высакародных сабак, наведваў асяродкі іх гадоўлі. У 1927 г. напісаў кніжку пра дрэсіроўку паляўнічых сабак, якую паўторна выдалі ў 1929 г., а потым яшчэ раз у 1931 г.

У ліпені 1911 г. Г. Карцову прысвоілі званне камергера царскага двара. У маі 1917 г. пераняў ён ад Дзіца пасаду царскага кіраўніка паляванняў. Пасля большменш года адмовіўся ад гэтай пасады, штораз змяняючай падначаленасць у даволі бурны перыяд. Яго далейшых лёсаў не ўдалося ўстанавіць. Г. Карцоў памёр праўдападобна напрыканцы 30-х або на пачатку 40-х гадоў XX стагоддзя.

Пётр Байко

Працаваць трэба было цэлы дзень

Успаміны Ніны МІНЦЭВІЧ з Орлі, народжанай у 1926 годзе.

У верасні 1941 года, калі мне было пятнаццаць гадоў, мяне вывезлі на прымусовыя работы. Спісак асоб, якія былі прымушаны выехаць на нявольніцкую працу ў Германію, састаўляў тадышні арлянскі солтыс Міхал Федаровіч. Ён у той спісак не заносіў сваіх сямейнікаў і добрых знаёмых. Тады з Орлі паехалі м.інш. Марыя Мартыновіч, якой — як і мне — было пятнаццаць, ды старэйшыя: Валя Севастыянчук, Альжбета Нестаровіч, Анна Гарлоўская, Міхал Тхарэўскі, Аляксандр Здановіч, Сяргей Куптэль, Базыль Мартыновіч, Ян Фіёнюк, Анатоль і Уладзімір Багацэвічы, Павел Альшэўскі (жанаты), а з Крывятыч Аляксандра Роля ды іншыя. Разам некалькі дзесяткаў маладых людзей у адзін асенні дзень паехалі фурманкамі ў Бельск, а далей цягнікам у Беласток. У Беластоку пераначавалі нас у Фарным касцёле. Харчаваліся тым, што кожны прыхапіў з дому. Не ўсе забралі з сабою харчы, дык тыя што мелі дзяліліся з імі. У наступны дзень павезлі нас поездам у Дзялдова ва Усходняй Прусіі. Там на станцыі выстраілі нас у дзве шарэнгі, а нямецкія гаспадары выбіралі нас у свае маёнткі.

Ніна Мінцэвіч з мужам Янам

Я трапіла ў маёнтак Прускен. Працавалі мы пры ўборцы бульбы і буракоў каля двух месяцаў. Вечарам скрэбла бульбу на наступны дзень. Спалі на падлозе — асобна жанчыны, асобна мужчыны.

Пасля пагрузілі нас у вагоны і сказалі, што паедзем дадому. Але праз суткі завезлі нас праз Берлін у Лейпцыг. Там зрабілі нам лекарскае абследаванне, завялі ў лазню. Усіх здаровых завезлі ў арбайтсамт у Рызу, а там баўэры разбіралі нас у свае гаспадаркі.

Я трапіла ў вёску Рохцан у павеце Ошац да гаспадара Фелікса Маўнэ. Быў ён удаўцом, а разам з ім жылі ягоныя бацькі, 17-гадовы сын Вано і 12-гадовая дачка Крыста. У гаспадара працавалі ўжо Марыян Каня з Аўгустава, Стэфан Валяшчык з Велюня, панна Ганка з Украіны ды сужонства Анка і Франак.

Працаваць трэба было ад чацвёртай гадзіны раніцы да шостай вечара, а ў час жніў ці сенакосаў — цэлы дзень. За той час былі толькі два паўгадзінныя перапынкі. Апрача працы ў полі да маіх пастаянных абавязкаў належала кармленне каля трыццаці свіней, забеспячэнне гаспадаровай хаты вугалем і дровамі ды штодзённае шматразовае мыццё пасуды. Кожную суботу выкідала гной з-пад свіней і пасля мыла там бетонную падлогу. Зімою мы, прымусовыя рабочыя, малацілі або рубалі дровы.

Жыла я ў неабаграваным памяшканні. І ў гаспадара таксама не абагравалася, толькі кухарка Фрыда прыносіла нанач мосенжныя тэрмафоры. Рабочых кармілі вельмі ашчадна — праз чатыры гады майго прабывання ў Германіі на снеданне ела я хлебны суп, а на вячэру вараную бульбу ў лупінах. На абед быў суп з кавалачкам мяса велічынёю ў каробку для запалкаў, вельмі рэдка бывала другое блюда. На цэлы тыдзень была толькі адна буханка жытняга хлеба ды плітка масла; усё гэта можна было з'есці ў адзін дзень.

Работнікам плацілі: дарослым каля дваццаці марак, а мне — пятнаццаць. Былі гэта талоны, „шайны", за якія можна было купляць вопратку і абутак, але для гэтага трэба было назбіраць многа талонаў. Да лекара было чатыры кіламетры і калі хто захварэў, гаспадар дазваляў ісці да яго.

Прымусовыя работнікі абавязаны былі насіць на вопратцы нашыўкі. Я не насіла, але раней напісала ў гміну ў Орлю, каб даслалі пасведчанне аб маёй нацыянальнасці; яны засведчылі што я — беларуска. А іншыя насілі нашыўкі: палякі — вялікую літару „P" на белым полі, рускія — „Ost" і г.д.

У недалёкай ад Рохцан вёсцы Вэйхтэрын у Лейпцыгскім павеце працавалі Ірына Новікава з Кіева, ды з Польшчы Юзэфа Смалень, Віктар Попа, Ян Кракоўскі і Ян Мінцэвіч — мой пазнейшы муж.

Як я ўжо згадвала, жыла я ў марным, неабаграваным зімою памяшканні. І ў такіх умовах у 1944 і 1945 гадах нарадзіла я дзве дачкі: Ірыну і Геню. У час цяжарнасці я выконвала ўсе цяжкія працы аж да родаў. Пасля родаў праз шэсць тыдняў працавала я ў хаце гаспадара, а пасля зноў вярталася да працы ў полі і на гаспадарцы.

Мой муж Ян трапіў на прымусовыя работы з нямецкага палону. 24 жніўня 1939 года ён быў мабілізаваны ў 86 пяхотны полк у Маладзечна. Ваяваў у Пятркове-Трыбунальскім і 5 верасня 1939 года трапіў у нямецкі палон. Праз семнаццаць месяцаў — да 6 студзеня 1941 года — прабываў у лагеры для палонных Stalag IVA ў Хоерсвердзе; адтуль трапіў да баўэра, дзе аставаўся — так як і я — да красавіка 1945 года — да вызвалення Чырвонай Арміяй.

Запісаў Міхал Мінцэвіч
Фота з архіва аўтара

Варожка праўду сказала

Успаміны Міхала ПАНФІЛЮКА, жыхара Нараўкі, народжанага ў 1916 годзе і яго жонкі Юліянны.

Міхал Панфілюк: Мае дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў Грабаўцы каля Дубіч-Царкоўных. Бацькі свайго я не памятаю, бо гаварылі, што памёр ён ад тыфу ў 1918 годзе. Маці адна гадавала мяне і сястру Олю. Старэйшы бацькаў брат Ігнат паехаў на Валынь і прадаў сваю частку гаспадаркі. Маці мая асталася без каровы і без каня. У хаце панаваў голад і холад. Маці шыла людзям башмакі, прала, ткала. Я з малых гадоў стаў пастушком. За бутэльку малака і кавалак хлеба пасвіў жывёлу ў багацейшых гаспадароў і кулакоў. Жыццё тады было цяжкое і толькі ў казках людзі марылі аб лепшай долі. Помню, што сусед Герман Шыманюк займаўся палітыкай і хаваўся ад паліцыі. У школу, дзе вучылі па-польску чытаць і рахаваць, я хадзіў чатыры зімы. З часам падрос, стаў юнаком, а сястра хутка выйшла замуж. Маім шваграм стаў сын войта Анапрыюка. Войт не жадаў, каб яго сын жаніўся з беднай дзяўчынай і ўсімі спосабамі хацеў не дапусціць да шлюбу. Нават падгаварыў бацюшку, каб не вянчаў. Але сын не паслухаў бацькі і пастанавіў згуляць вяселле ў бацькавай хаце. Паехалі мы пад царкву. Мама дала мне 32 злотых, каб я заплаціў за шлюб. Калі я зайшоў да папа і палажыў грошы на стол, той разгневаны швырнуў грошы на падлогу і сказаў, што не дасць шлюбу. Але на падмогу мне прыйшоў абураны Скамарох — мой хросны бацька. Ён так адважна паставіўся да папа, што той абразумеўся і згадзіўся маладых павянчаць. Помню, што прыгожая была служба ў царкве.

Пасля вяселля швагер з сястрою пераехалі ў вёску Махнатае. Там была шваграва „бабаўшчына" — гаспадарка па бабцы. Неўзабаве швагра прызвалі ў польскае войска. Мы з мамаю пайшлі памагаць сястры гаспадарыць. Абраблялі 7 гектараў зямлі. Сеялі лён, пшаніцу, авёс. Гадавалі пчол, мелі 19 вуляў. Пчалярству мяне вучыў Прычыніч, жыхар Махнатага. Было многа працы, але голад не дакучаў. Калі швагер вярнуўся з войска, то мы з мамай купілі ў Махнатым хатку і ў Грабавец ужо не вярнуліся.

У Махнатым я пазнаёміўся са сваёй будучай жонкай, Юліяннай Філіманюк. Бацька Юлі меў 25 гектараў зямлі і не думаў аддаць дачку за беззямельнага. Юля ж не хацела ісці замуж за багатага галоснага суседа, а выбрала мяне — беднага, ціхага. Зрэшты, няхай сама скажа.

Юліянна Панфілюк: Я была маладая і мела іншы погляд на жыццё. Мне хацелася вучыцца, але бацькі мяне не пусцілі. Апрача працы на зямлі яны больш нічога не бачылі. Да 1939 года свет для моладзі быў закрыты і ўсе сядзелі ў вёсцы. Тады інакш жылі чым цяпер. На наша вяселле бацькі купілі толькі 2 бутэлькі гарэлкі, а гасцей было паўсяла. Можна сказаць, што тады гарэлкі не пілі, але нюхалі.

Калі настала ў нас савецкая ўлада, маладых з вёскі сталі браць на працу ў Гайнаўку. Мы ўладкаваліся на тартак-лесапільню. Было добра, але хутка ўспыхнула вайна. Мужа мабілізавалі, а я пайшла да бацькоў у Махнатае.

Прыйшлі немцы, а Мішы не было 2 тыдні, ды не толькі яго. Разам з іншымі жанчынамі пайшла я ў Дубіны да варожкі, якая клала карты. Варожка мне сказала, што муж мой дзесьці недалёка блукаецца, скора прыйдзе, што мы будзем доўга і шчасліва жыць і нажывем сямёра дзяцей. Як бачыце, сказала праўду, бо так і сталася. Але ідучы дамоў я сумнявалася. У Гайнаўцы бачыла я, як немцы здзекаваліся над жыдамі. Загадалі ім пхаць па жалезнай дарозе вагоны з драўнінай і паганялі іх дубінкамі. Наплакалася я тады і вярнулася ў Махнатае.

Хутка прыйшоў Міша. Спачатку яго не пазналі, думалі, што нейкі палонны салдат. Худы, галодны, у нейкіх лахмоццях.

Міхал Панфілюк: Мая вайсковая часць адступала з баямі. Мне пашчасціла. Немцы нас акружылі, разбамбілі масты і дарогі. Хто астаўся ў жывых ратаваўся як мог. Мне ўдалося памяняць ваенную вопратку на цывільную. Ад Зэльвы за Ваўкавыскам да Махнатага ішоў пехатой. Меў бялізну сваёй работы і кусок свойскага мыла. Гэта мяне ўратавала. У Нарве добрая жанчына мяне накарміла, пераначавала. Яна таксама чакала сваіх блізкіх і паказала дарогу. Калі ехалі немцы, я хаваўся ў збожжа. Прыйшоў да цесця, а на падворку немцы. Мясцовыя бабы сказалі, што я з фронту. Але і гэтым разам лёс быў ласкавы. За мяне паручыліся цесць і солтыс. І так я зноў стаў працаваць на гаспадарцы ў Махнатым. Працавалі вельмі цяжка. Жончыны брат і сястра па загаду акупанта паехалі на працу ў Германію, а мы мучыліся ў Махнатым. Рукамі нажыналі 40 коп пшаніцы, рукамі малацілі. Мяне таксама трымалі цэлы тыдзень у Бельску, хацелі забраць у Германію. Адна баба параіла мне выпіць парашкоў ад болю галавы. Я выпіў шэсць і стаў сам не свой. Доктар прыняў мяне як моцна хворага, няздольнага да працы і адпусціў.

Пасля вайны людзі паверылі народнай уладзе і сталі будаваць новае жыццё. Мяне выбралі радным Арлянскай гміны. Час быў неспакойны. Сям-там па начах грымелі выстралы, дзейнічала па лясах узброенае падполле. У Нараўцы атрад Лупашкі расстраляў членаў ППР. А мяне назначылі войтам у Нараўцы. Зморай сялян былі тады абавязковыя пастаўкі збожжа і мяса. Не адзін войт усім не дагадзіў. Былі выпадкі, калі страшылі мяне сякерай, але астаўся ў жывых. Варожка праўду гаварыла.

Запісаў Мікалай Варанецкі

Папраўка

У артыкуле Віктара Шведа „Жыццё абарванае ў палове" аўтарам былі дапушчаны дзве памылкі: Ян Добаш занядужаў **12 мая 2003 г.**, а памёр 7 чэрвеня, пакінуўшы ў несуцешным смутку жонку **Крыстыну**. За памылкі перапрашаем зацікаўленых асоб і чытачоў.

Рэдакцыя

Золата цаглянага колеру з Ляўкова

Кераміка з'яўляецца найздаравейшым трывалым будаўнічым матэрыялам. З чырвонай цэглы можна ставіць нават шасціпавярховыя дамы. Яна таксама гукапаглынальная, што ў наш час вельмі важнае.

У Прадпрыемства будаўнічай керамікі „Ляўкова" ёсць чым пахваліцца. Вырабы ляўкоўскага прадпрыемства — каля 85% прадукцыі — гэта цэглы і пустакі самай высокай якасці.

Прадпрыемства дае працу для 140 чалавек. Кожны месяц выпускае столькі будаўнічых матэрыялаў, што можна з іх пабудаваць 90 аднасямейных дамоў. З усіх, дагэтуль выпушчаных з Ляўкова на рынак будаўнічых матэрыялаў, можна было б паставіць іх 30 тысяч.

ПБК мае на месцы ўдоваль асноўнай сыравіны — гліны ды спецыяльнага пяску. Гліну здабываюць тут жа за будынкамі фірмы і дастаўляюць яе ў цэх канвеерамі. Фірма мае ўдакументаваныя залежы, якіх хопіць на некалькі дзесяткаў гадоў.

З ляўкоўскай цэглы пабудавалі значную колькасць дамоў у Беластоку, рэгіёне і іншых гарадах краіны. Сёлета ў жніўні прадпрыемства будзе святкаваць юбілей 35-годдзя свайго існавання.

Янка Целушэцкі

Гайнаўка

Вучні — ганаровыя донары

Актыўна працуе гурток Польскага чырвонага крыжа ў Комплексе прафесійных школ у Гайнаўцы. Існуе ён 25 гадоў. Апекунамі гуртка на працягу гэтых гадоў былі Аляксандр Мусько, Мар'ёля Тэрэсяк і Барбара Пухальская. Прапагандавалі яны донарства сярод школьнай моладзі.

Зараз сярод вучняў Комплексу прафесійных школ 92 ганаровыя донары. Найбольш крыві на патрэбы аховы здароўя аддаў Арнольд Тарадынка. Крыху менш „дару жыцця" аддалі Рыгор Салагуба, Адам Марчук, Марцін Болбат, Моніка Мішчук, Збігнеў Віткоўскі, Кшыштаф Васілюк, Міраслаў Паўлоўскі і Марцін Папіс.

З юнымі донарамі сустракаюцца прадстаўнікі Раённага праўлення ПЧК, між іншым, старшыня Марыя Зданоўская, кіраўнік гайнаўскай Станцыі донарства Віктар Сахарчук. Усе вучні, якія аддалі каля літра крыві, атрымалі рэчавыя ўзнагароды Павятовага старостваў Гайнаўцы. Пры ўсім гэтым самы важным з'яўляецца стаўленне да донарства. Вучні ведаюць, што іх кроў ратуе жыццё іншым. (яц)

Гайнаўскі павет

Найлепшыя пажарныя каманды

У Нарве адбыліся спаборніцтвы добраахвотных пажарных каманд Гайнаўскага павета. Удзельнічала ў іх 120 пажарнікаў. Першынство заваявала каманда з Чаромхі-Вёскі. Другое і трэцяе месцы занялі пажарнікі з Нарвы і Ласінкі (Нарваўская гміна). Пераможцы ва ўзнагароду атрымалі бензапілу для сячэння дрэў, размеркавальнік і дынама-машыну. (яц)

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Кляшчэлеўскі элеватар

У Кляшчэлях побач чыгуначнай станцыі знаходзіцца збожжавы элеватар Беластоцкага прадпрыемства ПЗЗ. Будоўля ўзнікла пры камуне і служыла дзесяткі гадоў сялянам Гайнаўскага, Бельскага і Сямятыцкага паветаў. Зараз пустуе, пападае ў руіну. Дырэкцыя ПЗЗ намагалася падшукаць інвестара для добраўпарадкавання маёмасці, але такі не знайшоўся. Што будзе з элеватарам, цяжка сказаць. Мабыць, раздзеліць лёс большасці папаўшых у руіну прадпрыемстваў. Будзе разабраны і знікне з краявіду Беласточчыны.

Уладзімір Сідарук

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Востраў мінуўшчыны

Вёска Новы Востраў, што ў Шудзялаўскай гміне, распаложана так, быццам пасля скрыжавання была прадаўжэннем дарог, што выходзяць з Гуран і з Паўднёвага Вострава. Зараз побач згаданага скрыжавання стаіць усходні крыж (на здымку) з надпісам: „Боже помогай жителямъ и стел. скота — деревни Новаго Острова 1883 г."

На заходняй ветцы вясковай вуліцы пабачыў я пажылога мужчыну, які заміж дзяжурыць перад тэлевізарам, мо падумаў пра маладыя гады і выйшаў паглядзець на вуліцу, якая, хаця ў той спякотны дзень пустая і сумная, мабыць прыгадвала яму жыццярадасную маладосць. Спытаў я яго, што ён ведае пра ўзнікненне пабачанага мною крыжа, а ён мне адказаў, што пра гэта трэба пытаць старэйшых людзей. Але калі я пра тых старэйшых пацікавіўся, ён паведаміў мне, што старэйшых за яго ў вёсцы няма. Наймалодшаму жыхару Новага Вострава будзе мо з сорак, але ён п'е.

— А ён гаспадарыць ці дзе працуе? — зноў пытаю старажыла.

— І не гаспадарыць, і не працуе. Вось часам хто з пенсіянераў папросіць што зрабіць, заплаціць дваццаць злотаў, то і ёсць за што купіць пляшку ад рускіх.

Пайшоў я далей і неўзабаве пабачыў чарговы крыж — дубовы. Яго гарызантальны брус меў мо метры тры даўжыні, а моцна прысакрэчаныя часам даты падказвалі ягоную векавасць. За той век, мабыць, шмат разоў яго пераўкопвалі і можна толькі ўяўляць пра яго велічнасць пры высвячэнні.

Самая вёска жыве мінулым, нічога тут новага не будуецца, мо за выключэннем агароджы насупраць толькі што згаданага крыжа. На другі канец вёскі вяртаўся я па загуменнай вулачцы, з якой выдатна было відаць развал усяго таго, што раней служыла мясцовым жыхарам. У сонечны дзень, калі прыгравала быццам у пякельным катле, від вёскі прыводзіў на думку райскі запавет: „За тое, што ты паслухаўся жонкі тваёй (...) праклінаю зямлю за цябе. З нялёгкай працы будзе твой хлеб, пакуль не настане час табе вярнуцца ў зямлю, з якое ты ўзяты, бо ты прах і ў прах вернешся". Але наш спрытнюжны народ разбегся шукаць раю...

На паўночным канцы Новага Вострава стаіць яшчэ адзін крыж, своеасаблівы помнік бежанству, з эпітафіяй: „Упокой Господи душу усобшаго раба Твоего Андрея Парфенюка ум. въ дороге 1915 г."

Аляксандр Вярбіцкі

Манапаліст

Пошта Польская — гэта дзяржаўны манапаліст і ніхто нічога не можа сказаць. Тут, каб не быць галаслоўным, прывяду факты. Мне было выслана пісьмо з Кракава г.зв. прыярытэтнае, з паштовай маркай за 1,80 зл. Атрымаў я гэты ліст пасля 37 гадзін. У той самы час быў мне высланы звычайны ліст за 1,20 зл. з Гдыні і атрымаў я яго пасля 192 гадзінах. Трэцяе пісьмо, звычайнае, за 1,20 зл., было мне выслана з Белавежы, якое атрымаў па 50 гадзінах. Глядзеў я ўсе паштовыя штампы на тых трох лістах і вельмі здзівіўся, што з Белавежы да мяне хутчэй прыйсці пяшком, чым даслаць пісьмо. А з Гдыні, каб у суткі ішоў па 50 кіламетраў, дык прыйшоў бы хутчэй, чым пісьмо. Здарылася, што пісьмо з Гміннай управы ў Нарве атрымаў я на трэція суткі, а што справа важнай аказалася, дык вымушаны быў наняць самаход, каб даехаць на прыпынак ПКС у Трасцянку. Мусіў жа паспець на вызначаную Управай гміны гадзіну. Было гэта перад апошнімі самаўрадавымі выбарамі. Вось, як у нас дзейнічае пошта.

Мікалай Лук'янюк

Праваслаўныя манастыры

Ад 28 чэрвеня г.г. у Супраслі, Грабарцы, Яблачыне і Дайлідах праходзіў міжнародны жывапісны пленэр „Праваслаўныя манастыры". Яго ўдзельнікі рыхтавалі адначасова выстаўку карцін у Цэнтры праваслаўнай культуры ў Беластоку па вуліцы св. Мікалая 5. Выстаўка працавала адзін дзень — 11 ліпеня. (яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Фота МІХАЛА КОСЦЯ

Кветкавыя аберацыі

Змяя Ссапія і вуж Ззянон адчулі сябе ў гэты ліпеньскі гарачы ранак неяк няёмка. Поўзаючы сярод карчоў наўкол паляны, на якой звычайна праводзіліся сходы ўселяснога кіраўніцтва, заўважылі менш кветак, якімі звярына, асабліва ў свята, ахвотна вымошчвала месца свайго адпачынку.

— С-с-сто за ліха? — знервавалася Ссапія. — Яс-с-сцэ з не пара лыс-сець?

Якраз пачынаўся чарговы сход уселяснога кіраўніцтва. Мядзведзь Сандар Жоржавіч увайшоў на паляну, трымаючы ў пысе букет васількоў-валошак. Сеў на пень. Узяў кветкі ў лапу і ўзняў над галавой.

— Глядзіце толькі ўважліва на гэта. Вось — кветачкі. Гэтыя і іншыя дэпраўуюць нашу лясную брацію. Адцягваюць ад працы дзеля нашай супольнасці.

— Яны прыгожыя... — уздыхнула лань Гаўрусіха.

— І пахнуць прыемна, — дакінула вавёрка Кацюша.

— ... а аб прыбалотныя краскі і пачухацца добра, — прымроіў дзік Свіналыч.

— Ну і што? Красачкі! Прыгажосці і паху ў нас процьма. А чухацца ды качацца, дзік, можаш і ў самой гразі. Паўтараю: лясное кветкавінне нічому не служыць. Гэта толькі дэправацыя, дэмаралізацыя, дэпрэцыяцыя, дэмабілізацыя, правакацыя і гэткія там лібацыі. Зразумелі!

Кіраўніцтва зірнула на сябе крадком; падтакнула, хоць мала зразумела. Мядзведзь прадоўжыў:

— Пераходжу да справы. Ад заўтра ў нашым лесе кветак не будзе. Павырываць усе і сцерці, як гэтыя спакушальныя васількі. Хай сабе красачкамі жывуць у якіхсьці там Шварцвальдах, а не ў нас. Кыш на кветкі! Мы тут маем жыць працай дзеля дабра. Ну, і добра.

— Ну, і добра! — ціха азвалася кіраўніцтва.

— Ну, і добра?! — зароў мядзведзь.

— Ну, і добра! — адкрыкнулі сябры кіраўніцтва.

Гэтым воклічам і закончылася сустрэча. Змяя Ссапія і вуж Ззянон, прыглядаючыся ўсяму гэтаму з-за дуба, спляліся адно з адным.

— Ну, і добра! Ну, і вельмі добра! — засысыкаў Ззянон. — А мы будзем с-с-сеяць. Яны вырываць, а мы — сеяць. Яны — вырываць, а мы сеяць, сеяць, сеяць!..

Тым часам Сандар Жоржавіч вярнуўся ў сваю бярлогу. З куфэрка з нетутэйшай чырвонай драўніны, у апошні час напалову запоўненага вадой, падараванага яму з удзячнасці лясною браціяй, дастаў учарашнія васількі. Нюхаў іх ды нюхаў, аж зрабілася яму млосна ды санліва.

— Што рацыя, то... ацыя ! — прамармытаў і, дзе стаяў, заснуў.

МакХолад

Фэстываль Музыкі Маладой Беларусі

Басовішча 2003

18-19 ліпеня 2003 г., Гарадок, Беласточчына

18/19 ліпеня (пятніца/субота)

16^{30} — адкрыцьцё Фэстывалю
16^{45} — пачатак конкурснай часткі
21^{30} — канцэрт узнагароджанага гурту мінулагодняга выпуску — „Дзея”
22^{10} — „Зьніч”
22^{50} — „Rima”
24^{00} — „Зэт”
1^{10} — „Cool Kids of Death”

19/20 ліпеня (субота/нядзеля)

16^{00} — аб’яўленьне вынікаў конкурсу — канцэрт пераможцаў
17^{15} — „BN”
18^{00} — „Partyzone”
19^{00} — „Крама”
20^{10} — „Кальян”
21^{20} — „Deviation”
22^{30} — „Neuro Dubel”
23^{40} — „Zero-85”
0^{50} — „Уліс”
2^{00} — „Н.Р.М.”

Арганізатар — Беларускае Аб’яднаньне Студэнтаў — пакідае за сабою права ўносіць зьмены ў гэтую праграму.

Адзіная праўдзівая і акуратная гісторыя „Басовішча” па адрасе **http://niva.iig.pl/fmmb/fmmb.htm**

Адгаданка

	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31	32	33	34

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм.

1. самец буйной рагатай жывёлы
= 30 __ 20 __ 11 __;
2. падзея або частка драматычнага твора
= 32 __ 16 __ 34 __ 18 __;
3. без агню не бывае
= 28 __ 3 __ 1 __;
4. у роце, у баране, у галоўцы часнаку
= 33 __ 14 __ 13 __;
5. хросная маці дзіцяці
= 21 __ 10 __ 5 __ 29 __;
6. Станіслаў, польскі пісьменнік-фантаст
= 24 __ 23 __ 22 __;
7. румынская грашовая адзінка
= 7 __ 25 __ 27 __;
8. набажэнства = 9 __
12 __ 2 __ 8 __ 26 __ 6 __ 4 __;
9. месца, праз якое ўязджаецца
= 31 __ 17 __ 19 __ 15 __;

Ш

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 22 нумара

Баба, віно, грудзі, ліст, пірог, санкі, сена.

Рашэнне: **Каб свінні рогі, не саступіла б з дарогі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы

Рэдакцыя „Нівы” і Беларускі саюз Рэспублікі Польшча аб’яўляюць VIII Агульнапольскі конкурс беларускай паэзіі і прозы.

Тэматыка

Арганізатары не абмяжоўваюць тэматыкі дасыланых твораў. У конкурсе будуць разглядацца працы на беларускай мове.

Прынцыпы ўдзельніцтва

1. Конкурс праводзіцца ў трох узроставых групах:

— I група: дзеці і моладзь пачатковых школ і гімназій,

— II група: астатнія ўдзельнікі (выключна аўтары, якія не з’яўляюцца членамі літаратурных творчых саюзаў).

2. У рамках груп конкурс праводзіцца ў дзвюх катэгорыях: паэзіі і прозы.

3. Конкурсныя працы, надрукаваныя на машынцы або разборлівы рукапіс у чатырох экземплярах (паэтычныя творы — 3-5 вершаў, іншыя літаратурныя формы — аб’ёмам да 22 старонак стандартнага машынапісу) трэба падпісаць крыптанімам, пазначыць нумарам узроставай групы і паслаць на адрас:

Redakcja „Niwy”
ul. Zamenhofa 27
15-959 Białystok 2
skr. poczt. 149

з прыпіскай на канверце: VIII Ogólnopolski Konkurs Poezji i Prozy Białoruskiej.

4. Прозвішча, імя і дакладны адрас аўтара дасланых конкурсных прац трэба памясціць у асобным заклееным канверце, падпісаным звонку такім нумарам групы і крыптанімам, як і конкурсныя працы.

5. На конкурс трэба дасылаць творы, якія дагэтуль нідзе не друкаваліся і не ўзнагароджваліся на іншых конкурсах.

6. Арганізатары не вяртаюць дасланых твораў.

Тэрміны

1. Тэрмін дасылання конкурсных прац мінае **31 ліпеня 2003 г.** (вырашае дата паштовага штампа).

2. Вынікі конкурсу будуць аб’яўлены ў канцы верасня 2003 г.

3. Уручэнне ўзнагарод адбудзецца на адмысловай сустрэчы. Аб тэрміне мерапрыемства лаўрэаты і астатнія ўдзельнікі конкурсу будуць паінфармаваны і запрошаны прыняць у ім удзел.

Узнагароды

1. Арганізатары прыдбалі грашовыя і рэчавыя ўзнагароды. Дапускаюцца таксама ўсялякія іншыя ініцыятывы арганізацый і прыватных асоб з мэтай павелічэння колькасці ўзнагарод. Арганізатары будуць садзейнічаць такім ініцыятывам.

2. Арганізатары ўстанаўліваюць 1-3 узнагароды для найлепшых дэбютантаў. Аб падзеле і вартасці астатніх узнагарод рашае ўстаноўленае арганізатарамі журы.

3. Журы можа не выкарыстаць усяго фонду ўзнагарод.

4. Арганізатары прадугледжваюць магчымасць публікацыі ўзнагароджаных твораў (без права аўтараў на ганарары) на старонках „Нівы”, у агульнапольскім друку і па радыё.

Заключныя заўвагі

1. Працы, якія не адпавядаюць правілам конкурсу, не будуць разглядацца.

2. У справах, якія вынікаюць з супярэчлівага тлумачэння правілаў, канчатковае рашэнне выносяць арганізатары ў паразуменні з журы.

3. Сакратарыят конкурсу змяшчаецца ў:
Redakcja „Niwy”, ul. Zamenhofa 27
15-959 Białystok, tel. 743 50 22

ISSN 0546-1960